ЯК ПРЫЗВЫЧАІЦЦА ДА КАПРЫЗАЎ КЛІМАТУ 8

САЦЫЯЛОГІЯ ПАНДЭМІІ 4

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 МАЯ 2020 г. АЎТОРАК № 95 (29209)

ЦЫТАТА ДНЯ

Іван КРУПКО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі:

«Дзяржаўная аграрная палітыка Беларусі дазваляе ўлічваць змены, якія адбываюцца на рынку харчавання як унутры краіны, так і за яе межамі. Наша краіна, якая мае добры патэнцыял у аграрнай сферы, можа забяспечыць рост паставак харчавання ў краіны, якія сутыкнуліся з праблемай харчовай бяспекі ва ўмовах пандэміі. Мы прагназуем захаванне станоўчых тэндэнцый у вытворчасці прадуктаў харчавання і, адпаведна, маем дастатковыя рэсурсы для паставак прадукцыі як на ўнутраны рынак Еўразійскага эканамічнага саюза, так і за яго межы».

ВЯСКОВЫ «СЯБАР»

За свае ўмелыя і працавітыя рукі, неўтаймоўнае жаданне вынаходніцтва жыхара аграгарадка Смальяны Аршанскага раёна Міхаіла ШЧАРБІНСКАГА называюць «кулібіным». Міхаіл Іванавіч — былы калгасны вадзіцель і камбайнер, а цяпер пенсіянер, вельмі любіць майстраваць карысныя для жыцця прадметы і абсталяванне. У свой час з тэхнічных адходаў Міхаіл Іванавіч змайстраваў невялікі трактар і поўны для яго «арсенал» — плугі, бароны, культыватар, касільнае ўстройства, акучвальнікі, бульбасеялку і бульбакапалку, лапату для ачысткі снегу.

— Я прымусіў свой трактар выконваць усе цяжкія работы, — кажа смальянскі вынаходнік. — Для мяне гэта бюджэтны агрэгат — і па запчастках, і ў плане надзейнасці, і па расходзе паліва.

Маё знаёмства са Шчарбінскім адбылося каля агарода, на якім ужо была пасаджана бульба, і гаспадар завяршаў першае акучванне. Вясковы «кулібін» падзяліўся, што з маленства яго цягнула да матацыклаў і машын, і гэты трактар — ужо другі па ліку, зроблены ўласнымі рукамі. Дзякуючы трактару, які Міхаіл Іванавіч назваў вельмі проста — «Сябар», сёлетняя пасяўная і для самога ўладальніка эксклюзіва, і для суседзяў-аднавяскоўцаў ужо завяршылася.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- **Беларуская калійная кампанія падпісала кантракт на пастаўку калію ў Індыю па $230 за тону.**
- «Белпошта» павысіла тарыфы на перасылку міжнародных адпраўленняў.
- **НАН Беларусі і Акадэмія навук кітайскай правінцыі Гуандун створаць сумесны цэнтр прамысловых тэхналогій.**
- «Агат» распрацоўвае машыну радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай разведкі «Хімера».

- **Вызначаны пераможцы маладзёжнага конкурсу Startup Heart.**

ISSN 1990 - 763X

Мы разам!

Чэлендж супраць «кароны»

У барацьбе з каранавірусам камунальнікам Магілёўскай вобласці дапамагаюць звычайныя жыхары

Кірыл ДАРАШЭНКА адзін з такіх энтузіястаў. Прычым вельмі актыўны. Паспеў запаліць сваім прыкладам яшчэ некалькі дзясяткаў магіляўчан. Цэнтр гарадскіх ініцыятыў, актывістам якога ён з'яўляецца, арганізаваў чэлендж, і да добрай справы далучылася каля 70 паслядоўнікаў. Зараз у сацыяльных сетках хапае здымкаў, як па тым ці іншым адрасе нехта апрацоўвае камунальную нерухомасць. Але ў адрозненне ад іншых памочнікаў, якія абмяжоўваюцца адной акцыяй або адным домам, дзе жывуць самі, Кірыл Дарашэнка паспявае штодзённа рабіць дэзынфекцыю ў адзінаццаці (!) шматпавярховіках і на шасці дзіцячых пляцоўках.

— Усё пачалося месяц таму, — расказвае добраахвотнік. — Прачытаў аб'яву, якую павесіла ЖЭУ № 2 з паведамленнем, што ў сувязі са складанай эпідсітуацыяй пад'езды будуць апрацоўвацца двойчы ў дзень, і адразу зразумеў, што гэта нерэальна. І ў больш спрыяльныя часы дворнікаў не хапала. У мяне самога фірма, якая займаецца дэзынфекцыяй, дэзынсекцыяй, дэратызацыяй — змагаемся з мікробамі, пацукамі, насякомымі. Усё неабходнае абсталяванне ў мяне было, хімія таксама. Я патэлефанаваў у ЖЭУ і прапанаваў дапамогу. Начальнік адгукнуўся хутка, праз гадзіну ён ужо стаяў пад пад'ездам са спісам дамоў, двароў, якія пажадана было б апрацоўваць, і яшчэ прывёў з сабой начальніка суседняга ЖЭУ, які таксама меў патрэбу ў такіх добраахвотніках. Праўда, я адразу ж растлумачыў, што мяне на ўсе ЖЭУ не хопіць.

СТАР. 4

Культасвета

НОЧ ЗАЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ

Што літаратурны музей Петруся Броўкі паказаў на віртуальнай «Ночы музеяў»

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Міжнародны дзень і Ноч музеяў сёлета — адна з нешматлікіх культурных акцый, якія ў Беларусі вырашылі не пераносіць і не адмяняць, але адаптаваць да цяперашніх рэалій. Тыя музеі, бібліятэкі і выставачныя пляцоўкі, якім дазваляюць плошчы ці ўмовы, 16 — 18 мая запрашалі наведаць экспазіцыі асабіста — бясплатна ці за адносна невялікую плату, але абсалютная большасць музейных устаноў правяла свята за зачыненымі дзвярыма, цалкам у віртуальнай прасторы — праз анлайн-квэсты і экскурсіі, стрымы з экспазіцыйных залаў і запаснікаў, трансляцыі ў сацыяльных сетках і на YouTube-каналах.

СТАР. 5

Ва ўрадзе

ПАСЛАБЛЕННІ: ЦУКРОВЫЯ І ПАДАТКОВЫЯ

Савет Міністраў вызначыў кампаніі, якім будуць паскорана вяртаць ПДВ, і дазволіў купляць прадукцыю цукровых заводаў без канкурэнтных працэдур закупкі

Адпаведныя пастановы ўрада (ад 14 мая 2020 года № 282 і ад 15 мая 2020 года № 287) афіцыйна апублікаваныя на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

У спіс з 77 кампаній, якім будуць паскорана вяртаць падатак на дабаўленую вартасць, увайшлі ЗАТ «Атлант», Мінскі малочны завод № 1, Беларуская чыгунка, «Камунарка», ААТ «Амкадор» — кіруючая кампанія холдынга», ААТ «ММЗ імя С. І. Вавілава — кіруючая кампанія холдынга «БелОМА», МТЗ, МАЗ, Мінскі маторны завод, Брэсцкі мясакамбінат, «Савушкін прадукт», «Гомельтранснафта Дружба», «Белавія», «Лекфарм», БелАЗ і іншыя.

Пастанова № 282 рэалізуе Указ ад 24 красавіка 2020 года № 143 «Аб падтрымцы эканомікі». Плацельшчыкам, уключаным у спіс, залік розніцы паміж сумай падатковых вылікаў і агульнай сумай ПДВ, вылічанай па рэалізацыі тавараў (работ, паслуг), маёмасных правоў, ажыццяўляецца на працягу 10 рабочых дзён з дня прыняцця падатковым органам рашэння аб вяртанні такой розніцы.

Акрамя таго, урад дазволіў купляць прадукцыю ў цукровых заводаў без канкурэнтных працэдур закупкі. Саўмін унёс змяненні ў пастанову «Аб удасканаленні адносін у галіне закупак тавараў (работ, паслуг) за кошт уласных сродкаў», пашырыўшы пералік тавараў, на закупкі якіх за кошт уласных сродкаў не распаўсюджваецца дзеянне гэтага дакумента.

Пастановы ўступаюць у сілу пасля іх афіцыйнага апублікавання.

Марыя ДАДАЛКА.

Блізкая ўлада

ДАРОГІ, ДАЧЫ І РАМОНТ ЖЫЛЛЯ

Прамую лінію з жыхарамі Прынёмання правёў памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Іван ЛАЎРЫНОВІЧ.

За тры гадзіны яму патэлефанавалі 27 чалавек, якія закраналі як агульныя, так і прыватныя пытанні, часцей за іншых гучалі тэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, рамонту жылля і дарог.

— У прыватнасці, паступалі пытанні, якія датычацца бягучага і капітальнага рамонту жылля, добраўпарадкавання тэрыторый. Важна, што людзі не застаюцца абыякавыя, актыўна ўдзельнічаюць у гэтым працэсе. Многія звароты маюць канкрэтны характар: дзесьці бардзюр няправільна ўстанавілі, дзесьці асфальтавая дарожка не ў лепшым стане, — паведаміў журналістам па выніках прамой лініі Іван Лаўрыновіч. Ён падкрэсліў, што многія звароты становяцца падставай для аналізу становішча з выездам на месца. Сітуацыі, калі праблемы паўсталі з-за няякасных работ, недапушчальныя.

Па шэрагу зваротаў дадзены канкрэтныя даручэнні. Напрыклад, на прамую лінію патэлефанавала гродзенка, якая выхоўвае дзіця-інваліда. Шматкватэрны дом, у якім яны жывуць, пабудаваны каля 15 гадоў таму. Па словах жанчыны, пандус не адпавядае сучасным нормам, з каляскай зайсці ці выйсці з пад'езда цяжка. Сітуацыя ўзятая на кантроль, адпаведным службам неабходна ў самыя кароткія тэрміны прапанаваць варыянты вырашэння праблемы.

Таксама нагодай для сур'ёзнага разбору стане пытанне з дарогай у раёне індывідуальнай забудовы Ласосна-4, што ў абласным цэнтры. Пра яе стан адразу паведамілі некалькі чалавек. Дарогу нядаўна добраўпарадкавалі, з'явіліся тратуары, асвятленне, але, па словах тых, хто звяртаўся да памочніка Прэзідэнта, якасць пакрыцця праезнай часткі нездавальняючая. Устараняць праблемы за ўласны кошт, хутчэй за ўсё, будзе арганізацыя, якая выконвала гэтыя работы.

Іван Лаўрыновіч адзначыў, што некаторыя пытанні носяць сезонны характар. Напрыклад, вясной людзі паехалі на дачы і агароды, і тут жа сталі часцей з'яўляцца звароты, якія датычацца зямельных адносін, прыватызацыі.

Паводле БелТА.

❍ Тым часам

21 мая з 10.00 у Крупскім райвыканкаме асабісты прыём грамадзян будзе праводзіць намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ. Папярэдні запіс па тэлефоне 8 (01796) 2-77-47.

Афіцыйна

ПАДТРЫМКА ТЫМ, ХТО ДАПАМАГАЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў арганізацый, якія аказваюць сацыяльныя паслугі»

Дакумент прадугледжвае надбаўкі работнікам дзяржаўных устаноў сацабслугоўвання, якія працуюць з пацыентамі, што маюць інфекцыйныя захворванні, і грамадзянамі, якія аднесены да кантактаў першага ўзроўню.

Сума ўстанаўліваецца ў залежнасці ад катэгорыі работнікаў і ступені іх зносін з хворымі.

Пры выяўленні выпадкаў інфіцыравання і кантактаў з інфіцыраванымі, асобамі — кантактамі першага ўзроўню надбаўка для ўрачоў-спецыялістаў складзе 1,5 тысячы рублёў, для медыкаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй — 1,3 тысячы, для іншых работнікаў — 900 рублёў.

Пры адсутнасці ў арганізацыях выяўленых выпадкаў інфекцый і асоб, якіх аднеслі да кантактаў першага ўзроўню, дапамога ўрачам-спецыялістам складзе 500 рублёў, медработнікам з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй — 400 рублёў, іншым катэгорыям супрацоўнікаў — 250.

Таксама работнікам сацабслугоўвання падчас работы вахтавым метадам даюцца памяшканні для пражывання ў арганізацыях і выплачваецца кампенсацыя.

АКТ ГУМАНІЗМУ

Па амністыі ў сувязі з 75-годдзем Перамогі будуць вызвалены амаль 5,4 тысячы чалавек

Асобным катэгорыям асуджаных, якія не падлягаюць поўнаму вызваленню ад крымінальнай адказнасці, прадугледжваецца скарачэнне тэрміну пакарання ў выглядзе пазбаўлення або абмежавання волі на адзін год. Іх колькасць складзе каля 6,4 тысячы чалавек. Адпаведны закон, прыняты парламентам, падпісаны Прэзідэнтам Беларусі.

У дакуменце вызначаны катэгорыі грамадзян, якія падлягаюць вызваленню ад пакарання. Гэта непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, пенсіянеры, інваліды першай і другой груп, ветэраны баявых дзеянняў, асобы, якія атрымалі раненні ў перыяд праходжання службы, пацярпелыя ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і некаторыя іншыя катэгорыі асуджаных і абвінавачаных. Паводле даных Міністэрства ўнутраных спраў, колькасць такіх грамадзян складзе каля 5,4 тысячы чалавек.

Катэгорыя тых, хто не падлягае поўнаму вызваленню ад крымінальнай адказнасці, сёлета ў сувязі са значнай датай пашырана. Скарачэнне тэрміну пакарання ў выглядзе пазбаўлення або абмежавання волі на адзін год будзе датычыцца грамадзян, асуджаных за карупцыйныя злачынствы, а таксама за злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў (за выключэннем паўналетніх, асуджаных за нарказлачынствы, учыненыя ў складзе арганізаванай групы або з выкарыстаннем лабараторнага абсталявання, якія пацягнулі смерць чалавека).

Амністыя будзе праводзіцца на працягу шасці месяцаў з даты ўступлення закона ў сілу.

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ СЕМ'ЯЎ І ІНВАЛІДАЎ

З 1 верасня 2020 года шматдзетным сем'ям павялічаць перыяд штомесячнай сацыяльнай дапамогі да 12 месяцаў

... А крытэрый тых, хто мае патрэбу, павялічаць да 115 працэнтаў БПМ (бюджэту пражытковага мінімуму). Гэтыя і іншыя навацыі прадугледжаны Указам Прэзідэнта «Аб сацыяльнай падтрымцы асобных катэгорый грамадзян», які Аляксандр Лукашэнка падпісаў учора.

Указам прадугледжана з 1 студзеня 2021 года жанчынам, якія нарадзілі чацвярых дзяцей, залічваць у працоўны стаж для прызначэння пенсіі час знаходжання ў водпуску па доглядзе за дзіцем працягласцю да 12 гадоў увогуле (цяпер 9 гадоў). Прызначаць ім працоўныя пенсіі пры наяўнасці стажу працы не менш за 20 гадоў і страхавога стажу не менш за 10 гадоў (цяпер 17 гадоў 6 месяцаў).

З першага дня будучага года інвалідам 1-2 груп, якія маюць інваліднасць больш за 10 гадоў, будуць зніжаны патрабаванні да страхавога стажу для прызначэння пенсіі па ўзросце.

Інвалідам з дзяцінства на 5 гадоў знізяць патрабаванні да працягласці працоўнага стажу для атрымання права на датэрміновую пенсію па ўзросце.

«Акрамя таго, бацькам дзяцей-інвалідаў з цяжкай ступенню страты здароўя, якія доўгі час ажыццяўляюць догляд за імі (не менш за 20 гадоў), будзе павышаны памер сацыяльнай пенсіі да ўзроўню, які супастаўны з мінімальнай пенсіяй па ўзросце (да 243,39 рубля пры цяперашнім памеры 123,39 рубля), — вызначана ва ўказе. — Прадугледжана таксама, што работнікам з няпоўным страхавым стажам (звыш 10 гадоў, але менш запатрабаванага) будуць наўзамен сацыяльнай пенсіі прызначаць працоўную пенсію па ўзросце пры няпоўным страхавым стажы».

Яшчэ адна навацыя датычыцца сем'яў, дзе ўзрост жанчыны да 40 гадоў. Пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў такім парам будзе бясплатна дадзена адна спроба экстракарпаральнага апладнення.

Марыя ДАДАЛКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Папа Рымскі правёў першую публічную імшу пасля каранціну

Яна прайшла ў базіліцы Святога Пятра ў Ватыкане, піша La Repubblica. Сабор быў зачынены 69 дзён з-за каранавіруса. Імша стала таксама апошняй, якая транслявалася ў інтэрнэце. Богаслужэнне прайшло ўчора ў капліцы Іаана Паўла II у дзень 100-годдзя з дня нараджэння пантыфіка, які ў 2014 годзе быў прылічаны да святых. «Сёння тут мы можам сказаць: 100 гадоў таму Гасподзь наведаў свой народ», — заўважыў падчас богаслужэння Папа Францыск. На імшы прысутнічала каля 30 чалавек. Яны размясціліся з улікам патрабаванняў сацыяльнага дыстанцыявання, але маскі меліся не на ўсіх, піша газета. У Італіі цэрквы былі зачыненыя з сакавіка з-за пандэміі. Імшы з Ватыкана з 9 сакавіка транслявaліся праз інтэрнэт. У маі ўрад краіны пачаў паслабляць каранцінныя меры ў сувязі са зніжэннем захваральнасці.

Прэзідэнт Афганістана падпісаў пагадненне аб падзеле ўлады

Ашраф Гані падпісаў пагадненне аб падзеле ўлады са сваім палітычным канкурэнтам Абдулой Абдулой. Пасля прэзідэнцкіх выбараў, якія адбыліся летась у верасні, адразу два кандыдаты прынялі прэзідэнцкую прысягу. Аб перамозе заявіў як дзеючы прэзідэнт Ашраф Гані, так і прэм'ер-міністр краіны Абдула Абдула. Цэнтральная выбарчая камісія Афганістана заявіла, што на выбарах з невялікім адрывам перамог Гані, але Абдула палічыў, што вынікі галасавання былі сфальсіфікаваныя. З сакавіка, калі Гані і Абдула адначасова правялі цырымоніі інаўгурацыі, палітыкі спрабавалі дамовіцца. Цяпер яны падпісалі пагадненне, згодна з якім прэзідэнтам застаецца Гані, але Абдула атрымлівае права прызначыць ва ўрад такую ж колькасць міністраў, як і кіраўнік дзяржавы. Як перадае агенцтва Reuters, перамовы паміж двума палітыкамі аб тым, як паміж імі размяркуюцца сферы ўплыву, працягваюцца.

Пуэрта-Рыка правядзе рэферэндум аб уваходжанні ў склад ЗША

Губернатар Пуэрта-Рыка Ванда Васкес Гарсед падпісала законапраект аб правядзенні 3 лістапада 2020 года рэферэндуму па пытанні аб уваходжанні краіны ў склад Злучаных Штатаў Амерыкі — ужо шостага ў гісторыі Пуэрта-Рыка, паведамляе агенцтва EFE. На рэферэндум, па інфармацыі El Exelcior, будзе вынесена адзінае пытанне: «Ці павінна Пуэрта-Рыка неадкладна быць прынята ў саюз (у склад ЗША. — **Рэд.**)?» Рэферэндум носіць неабавязковы характар, паколькі змяненне статусу немагчыма без адабрэння Кангрэсам ЗША, які не рабіў ніякіх захадаў пасля папярэдніх пяці плебісцытаў, адзначае выданне. Пуэрта-Рыка з 1952 года мае статус «неінкарпараванай тэрыторыі», залежнай ад Злучаных Штатаў. Пуэртарыканцы з'яўляюцца грамадзянамі ЗША, але не маюць права галасаваць на выбарах прэзідэнта. Жыхары вострава вызвалены ад амерыканскага падаходнага падатку, але пры гэтым, як адзначае El Exelsior, плацяць падаткі на сацабарону, унёскі Medicare, атрымліваючы пры гэтым менш федэральных сродкаў, чым штаты на кантыненце.

На слыху

Больш за 120 добраахвотнікаў сталі донарамі плазмы

Гэта дапамагло пайсці на папраўку паўсотні чалавек, хворых на COVID-19

У Беларусі на 18 мая 30 572 выпадкі COVID-19, паведамляе Міністэрства аховы здароўя. За суткі колькасць інфіцыраваных выросла на 922 чалавекі. Усяго з пачатку ўспышкі ў нашай краіне праведзена 364 319 тэстаў, за суткі — 13 804. За ўвесь перыяд распаўсюджвання інфекцыі на тэрыторыі Беларусі памёр 171 пацыент (за суткі — шэсць). Паправіліся і выпісаны ці зняты з амбулаторнага назірання 10 130 чалавек, у якіх раней быў пацверджаны дыягназ COVID-19, з іх 198 — за суткі.

Адным з эфектыўных спосабаў лячэння каранавіруснай інфекцыі як у свеце, так і ў Беларусі лічыцца пераліванне плазмы з антыцеламі. На сёння ў нашай краіне больш за 120 чалавек, якія перахварэлі на COVID-19, сталі донарамі плазмы. Пры гэтым зарэгістравана больш за 200 ахвотных запісацца на данацыю, аднак не ўсе падышлі з-за супрацьпаказанняў ці адсутнасці антыцел.

Больш чым сотні хворых у цяжкай форме была пералітая донарская плазма. У прыкладна паловы з іх назіраецца станоўчая дынаміка, паведаміў у эфіры тэлеканала СТБ **дырэктар РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій Фёдар КАРПЕНКА.**

— Тактыка змянілася, у адрозненне ад таго, што мы першапачаткова планавалі. Зараз мы кажам пра якасць плазмы: бачым цітры антыцел і адбіраем найбольш моцную плазму. Сёння ў нас сфарміравана база ўсіх тых рэцыпіентаў — пацыентаў, якім была выкарыстана плазма.

Паводле слоў Фёдара Карпенкі, у 50 пацыентаў назіраецца станоўчая дынаміка, у іх ліку ёсць тыя, хто паправіўся. **Донарскую плазму выкарыстоўваюць для цяжкіх пацыентаў. Іх родныя павінны разумець, што рашэнне аб неабходнасці пералівання прымае ўрач. І ў некаторых выпадках варта адмовіцца ад пошуку донараў праз сацыяльныя сеткі, асабліва за асобнае матэрыяльнае ўзнагароджанне.**

— Не трэба абяцаць грашовыя дадатковыя выплаты. Паверце, уся плазма, што нарыхтоўваецца, адразу аддаецца нашым пацыентам. І ні адзін донар не адмовіў нам з-за грошай, не сказаў: я не прыйду, бо мала плаціце, мала льгот, гарантый і кампенсацый, — падкрэсліў кіраўнік РНПЦ.

Каб здаць плазму, павінна прайсці два тыдні ад моманту выздараўлення. Донар праходзіць паглыблены медыцынскі агляд і здае неабходныя аналізы. Сама данацыя доўжыцца ад 30 да 50 хвілін. 99 % донараў пераносяць забор плазмы без пабочных эфектаў. У РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій плануецца абследаваць каля дзвюх тысяч пастаянных донараў на наяўнасць антыцел да COVID-19. Як адзначыў Фёдар Карпенка, каля 70 % насельніцтва як у свеце, так і ў Беларусі пераносяць каранавірусную інфекцыю бессімптомна. Таму магчыма, антыцелы ёсць у тых людзей, якія пра гэта не падазраюць.

Алена КРАВЕЦ.

Парламенцкі дзённік

УКЛАДАЦЬ У АЙЧЫННУЮ ЭКАНОМІКУ

Праект закона «Аб змяненні законаў па пытаннях валютнага рэгулявання і валютнага кантролю» падрыхтаваны да другога чытання

Прыняцце закона — чарговы крок па стварэнні новай мадэлі валютнага рэжыму з пераходам ад дырэктыўных метадаў рэгулявання да эканамічных, якія забяспечваюць празрыстасць правядзення валютных аперацый, дазваляюць своечасова выяўляць знешнія і ўнутраныя эканамічныя рызыкі.

Сярод асноўных навацый дакумента: скарачаюцца дазволеныя выпадкі выкарыстання на тэрыторыі Беларусі замежнай валюты, вызначаецца іх выключны пералік, за суб'ектамі гаспадарання замацавана права набываць замежную валюту праз банкі або на біржы без дэкларавання мэт яе далейшага выкарыстання, юрыдычныя асобы-рэзідэнты змогуць самі вызначаць тэрміны залічэння валютнай выручкі на свае рахункі, адкрытыя як у беларускіх, так і замежных банках. Таксама выключаецца працэдура выдачы Нацыянальным банкам дазволаў на правядзенне валютных аперацый у выпадках, калі валютным заканадаўствам іх правядзенне не дапускаецца, у законапраекце замацавана права Нацбанка на сумеснае з Саветам Міністраў увядзенне не больш чым на адзін год валютных абмежаванняў пры ўзнікненні крызісных сітуацый.

«Змякчэнне валютнага рэжыму павінна закласці добрую аснову для павышэння эфектыўнасці і далейшага развіцця фінансавага рынку Беларусі. Пры гэтым фарсіраванне прыняцця мер па лібералізацыі валютных адносін, па нашай ацэнцы, будзе садзейнічаць пераадоленню негатыўных тэндэнцый у эканоміцы і пашыраць свабоду эканамічнай дзейнасці. Чакаецца, што прыняцце закона дасць магчымасць павысіць узровень даверу да дзяржавы з боку бізнесу і грамадзян, радыкальна будзе спрыяць паляпшэнню дзелавога, інвестыцыйнага клімату, — перадае БелТА словы **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах ніжняй палаты парламента Пятра ВАБІШЧЭВІЧА.** — Канцэнтрацыя дзяржаўных органаў на маніторынгу патокаў грашовых сродкаў, а не правядзенне праверак павінна стварыць умовы для сістэмнай трансфармацыі беларускай эканомікі, калі ўкладваць у яе будзе больш выгадна, чым у сумежных дзяржавах і канкурэнтах на рэгіянальным і сусветным рынках».

Нагадаем, што законапраект унесены ў парламент Саветам Міністраў і прыняты ў першым чытанні 19 лістапада 2019 года.

Прыёмная кампанія — 2020

СТАРТУЕ АПОШНЯЯ «РЕПЕТЫЦЫЯ» ЦТ

З 19 мая ўсім ахвотным дадзена магчымасць прыняць удзел у трэцім этапе рэпетыцыйнага тэсціравання ў электронным фармаце ў анлайн-рэжыме на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.

Папярэдняй рэгістрацыі для ўдзелу ў «рэпетыцыі» экзамену не патрабуецца. Скарыстацца гэтай паслугай і прайсці тэсціраванне можна ў любы зручны час. Паслуга па праходжанні трэцяга этапу рэпетыцыйнага тэсціравання ў анлайн-рэжыме будзе аказана ў досыць працяглым часавым інтэрвале, які дазваляе задаволіць у ёй патрэбы ўсіх абітурыентаў.

Для ўдзелу неабходна, як і раней, зарэгістравацца ў сваім асабістым кабінеце на сайце www.rikc.by. Пры рэгістрацыі можна будзе скарыстацца адной ці некалькімі свабоднымі аплатамі, якія былі вернутыя пры адмене раней запланаваных сеансаў рэпетыцыйнага тэсціравання, ці ажыццявіць аплату праз сістэму «Разлік» (АРІП). Кошт рэпетыцыйнага тэсціравання складае сем рублёў за адзін прадмет.

Калі абітурыент рэгіструецца для праходжання рэпетыцыйнага тэсціравання ўпершыню, ён павінен стварыць свой асабісты кабінет удзельніка рэпетыцыйнага тэсціравання на сайце РІКВ, выкарыстоўваючы ўкладку «РТ, on-line рэгістрацыя».

Трэба нагадаць, што ў маі ў краіне праходзіць рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні, якая завершыцца 1 чэрвеня. Як ужо паведамлялася раней, у сувязі з напружанай эпідэміялагічнай сітуацыяй тэрміны здачы ЦТ будуць зрушаныя арыенціровачна на два тыдні. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў растлумачылі, што абітурыентам, якія ў ходзе рэгістрацыі на ЦТ ужо атрымалі або атрымаюць пропускі да зацвярджэння новага графіка правядзення цэнтралізаванага тэсціравання, абменьваць іх не спатрэбіцца. Дадатковая інфармацыя будзе размешчана на сайце www.rikc.by пасля таго, як новы графік будзе зацверджаны.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Аты-баты

РАКЕТЧЫКІ АДПРАВІЛІСЯ НА ВУЧЭННІ

З 16 да 23 мая ў Беларусі праводзяцца тактычныя вучэнні з падраздзяленнямі ракетных войскаў Узброеных Сіл. Кіруе імі начальнік ракетных войскаў і артылерыі Узброеных Сіл — начальнік упраўлення ракетных войскаў і артылерыі Генеральнага штаба Узброеных Сіл генерал-маёр Генадзь Казлоўскі. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве абароны.

Вучэнні праходзяць на некалькіх палігонах. Сярод іх — Гожскі, Брэсцкі, Нёман, а таксама мясцовасць непадалёку ад Астраўца. Ракетчыкі павінны адпрацаваць некалькі вучэбных пытанняў. Падраздзяленні мусяць перамясціцца ў раёны выканання задач, пасля заняць раёны сканцэнтравання. Іх неабходна замаскіраваць, арганізаваць ахову і абарону і падрыхтавацца да вядзення баявых дзеянняў. Яны і стануць кульмінацыяй вучэнняў — вайскоўцы будуць несці баявое дзяжурства і нанясуць ракетныя ўдары са зменай стартавых пазіцый.

— Гэтыя вучэнні носяць комплексны характар, — паведамілі ў Міністэрстве абароны. — Яны дазволяць праверыць здольнасць камандзіраў падраздзяленняў кіраваць, а падначаленых аператыўна выконваць пастаўленыя задачы ў складанай абстаноўцы, якая да таго ж хутка змяняецца. І па іх выніках будзе ацэнены ўзровень падрыхтоўкі падраздзяленняў ракетных войскаў за паўгоддзе.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Надвор'е

Цяпло нам толькі сніцца

Не адпускае холад, які прыйшоў з боку поўначы Еўропы

Ужо тыдзень, як гаспадаром надвор'я ва Усходняй Еўропе стала арктычнае паветра. У гэты час сярэднясутачная тэмпература ў нашай краіне на 3—7 градусаў ніжэй за кліматычную норму. І пацяплення не відаць. Паветраныя масы будуць у асноўным паступаць з паўночных шырот, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень будзе пераважаць воблачнае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы, у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Максімальная тэмпература паветра будзе ад плюс 11 градусаў да плюс 17 градусаў. У сераду пад уплывам няўстойлівых халодных паветраных мас будзе воблачна з прасяненнямі. Месцамі, пераважна па паўночным усходзе краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Вецер прагназуецца паўночна-заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, удзень будзе ад плюс 8 да плюс 14 градусаў, па паўднёвым захадзе краіны — да 16 градусаў цяпла.

У чацвер захаваецца ўплыў халодных няўстойлівых паветраных мас, якія паступаюць з поўначы Еўропы. Будзе воблачна з прасяненнямі. Уначы па паўночным усходзе, удзень на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, уначы ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—5 цяпла, месцамі чакаюцца замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень будзе ад плюс 7 да плюс 14 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу месцамі, у асноўным ва ўсходніх і цэнтральных раёнах краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы, ноччу па паўночным усходзе магчымы мокры снег. Вецер прагназуецца паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 цяпла, у асобных раёнах чакаюцца замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень будзе 8—15 цяпла, па захадзе — да плюс 17 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Чэлендж супраць «кароны»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каб зразумець маштабы работы Кірыла, уявіце сабе цэлы жылы квартал. У першы дзень, каб абысці ўвесь вялікі ўчастак, яму спатрэбілася сем (!) гадзін. Гэта цяпер, калі ён ужо ўвайшоў у рытм, яго сталі пазнаваць жыхары і загадзя адчыняць дзверы пад'ездаў, хапае пяці гадзін. І самае дзіўнае, яго гэта справа не напружвае. Больш за тое, ён адну з дзіцячых пляцовак апрацоўвае па сваёй ініцыятыве. Яна знаходзіцца на балансе прыватнай жыллёва-камунальнай кампаніі, але Кірыл бачыць, што ёй ніхто не займаецца, а дзеці гуляюць там пастаянна.

Пакуль прадпрымальнік карыстаецца выключна сродкамі, якія купляе за свой кошт. Набывае балоны для апырсквання, якія, дарэчы, ляцяць вельмі хутка. Мяняе картрыджы ў рэспіратары, выкарыстоўвае ўласны касцюм, які ўжо за больш чым месяц эксплуатацыі даволі-такі знасіўся, ахвяруе сваім вольным часам.

— Па хіміі мяне хопіць яшчэ дзён на пяць, максімум, — кажа ён. — У сярэднім на апрацоўку майго ўчастка ідзе 50 літраў прэпарату расійскай вытворчасці, які прызначаны для апрацоўкі розных аб'ектаў, у тым ліку дзіцячых пляцовак. Там пазначана, што ён эфектыўны супраць свінога і птушынага грыпу. Расіяне цяпер гэты дэзсродак не пастаўляюць, і ў Мінску мне яго ўжо не адпускаюць. Буду браць у ЖЭУ. Касцюм мыю, цырую, пальчаткі і картрыджы яшчэ ёсць, новы балон нядаўна купіў, яшчэ працуе. Трэба будзе, яшчэ куплю. Але спыняцца не збіраюся, буду працаваць да зніжэння напалу эпідабстаноўкі. У мяне ёсць вопыт, абсталяванне. Раблю гэта не дзеля рэкламы, так мяне маці выхавала. Цэнтр гарадскіх ініцыятыў мяне маральна падтрымлівае і распаўсюджвае мой вопыт. Пакуль нічога іншага мне і не трэба.

Фота Цэнтра гарадскіх ініцыятыў.

На сваім участку Кірыл — асоба ўжо вельмі папулярная. Калі спачатку фатаграфавалі і спалохана пыталіся: у нас што, «карона»? — цяпер здалёк вітаюць, адразу ж адкрываюць дзверы пад'ездаў, некаторыя нават гарбату прапануюць. Асабліва добра ставяцца да свайго валанцёра бабулькі, некаторыя нават просяць кватэру апрацаваць. А маладыя маці ўдзячныя, што клапоцяцца пра іх дзяцей, — цяпер вулічнае абсталяванне для гульні бяспечнае. Кірыл з усмешкай прыгадвае выпадак, калі маладая жанчына высунулася з акна, каб крыкнуць яму «дзякуй». Прыемна, калі тваю работу заўважаюць.

Тое, што вірус небяспечны, Дарашэнка дакладна ведае.

— Калі пачынаў, думаў, што тут больш панікі, але цяпер, калі гэта закранула маіх блізкіх, сумненні скончыліся, — кажа суразмоўнік. — Людзі ўжо псіхалагічна стаміліся, пачалі расслабляцца, а гэта небяспечна. Пакуль статыстыка Міністэрства аховы здароўя не будзе зведзена да нуля, усе меры важныя: і маскі, і апрацоўка, і дыстанцыяванне. Як можна разнявольвацца, калі кожны дзень прырост пад тысячу? А вось што мяне па-сапраўднаму радуе, дык гэта тое, што бяда з'яднала беларусаў. Вакол столькі прыкладаў сапраўднага гераізму. Гэта паказвае, што мы народ спагадлівы, калі трэба, збяромся і дапаможам. Людзі на фоне гэтай навалы згуртаваліся і дэманструюць усяму свету сваю салідарнасць.

ДА ВЕДАМА

Абавязковыя пакватэрныя абыходы ў Магілёўскай вобласці часова адменены. Адзіная падстава для наведвання — аварыйная сітуацыя.

— Выконваюцца толькі тыя работы, якія датычацца бяспечнага пражывання грамадзян, — удакладняе **начальнік аддзела ПТА ЖРЭУ Кастрычніцкага раёна Сяргей ЕРМАЧОНАК.** — Сёння людзі, калі і выклікаюць, то для вырашэння нейкіх праблем па месцах агульнага карыстання.

У Магілёўскім абласным цэнтры інфармацыйных сістэм растлумачылі, што складаныя санітарна-эпідэміялагічныя ўмовы яшчэ не падстава эканоміць на камунальных паслугах. Барацьба з неплацельшчыкамі працягваецца. Для работнікаў, якія вымушаныя наведваць неплацельшчыкаў, набыты індывідуальныя сродкі аховы.

Фота аб'яднання «ЖКГ Магілёўскай вобласці».

КАМПЕТЭНТНА

Валерый МАЛАШКА, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама:

— Роля штаба па мінімізацыі рызыкі распаўсюджвання каранавіруса — гэта штодзённы аналіз сітуацыі, якая складваецца па кавід-інфекцыі ў рэгіёне, вылучэнне праблемных зон і маментальнае вырашэнне тых ці іншых сітуацый. Мы сёння праводзім жорсткае расследаванне па кожным выпадку, і гэта эфектыўна. Практычна 73 % пацверджанай кавід-інфекцыі — гэта ў кантактаў 1-га і 2-га ўзроўняў. Гэтыя асобы знаходзяцца ў самаізаляцыі, а тыя, якія маюць прыкметы віруснай інфекцыі або пнеўманіі, — у стацыянарах. Гэта дае магчымасць мінімізаваць наступствы.

Што датычыцца камунальных службаў, то перад імі стаіць задача прафілактыкі распаўсюджвання інфекцыі. Таму на ўзроўні старшыні аблвыканкама прыняты цэлы шэраг рашэнняў, ёсць комплексны план мерапрыемстваў, якому падпарадкоўваюцца не толькі дзяржаўныя ўстановы і прадпрыемствы, але і суб'екты прыватнай формы ўласнасці. Але ў справе задзейнічаны не толькі камунальныя службы, але і органы ўнутраных спраў, мытнікі, іншыя службы. УУС вядзе кантроль за самаізаляванымі. Такіх у нас на 13 мая было каля шасці тысяч чалавек. Плюс мы адсочваем успышкавыя захворванні. Штодзённа прапрацоўваем усе неабходныя тэхналогіі, забяспечваем сродкамі аховы, ствараем дадатковыя кіслародныя пункты ва ўстановах аховы здароўя, размяжоўваем у паліклініках і бальніцах «брудныя» і «чыстыя» зоны. А яшчэ мы захоўваем досыць хуткае тэсціраванне, што таксама дае нам магчымасць аператыўна рэагаваць і своечасова прымяняць супраціўэпідэмічныя меры. Зараз у вобласці працуе чатыры дыягнастычныя лабараторыі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

У ТЭМУ

Як растлумачылі ў дзяржаўным аб'яднанні «ЖКГ Магілёўскай вобласці», з мэтай папярэджання завозу і распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі COVID-19, жыллёва-камунальнымі арганізацыямі вобласці штодзённа праводзіцца дэзынфекцыя ў месцах агульнага карыстання шматкватэрных жылых дамоў і інтэрнатаў з улікам перыядычнасці, зацверджанай Магілёўскім аблвыканкамам і галоўным дзяржаўным санітарным урачом Магілёўскай вобласці. У дамах апрацоўваюцца паверхні дамафонаў, дзвярныя ручкі, кнопкі ліфтаў, парэнчы, паштовыя скрыні. Вільготная прыборка з выкарыстаннем дэзынфекцыйных сродкаў месцаў агульнага карыстання шматкватэрных жылых дамоў ажыццяўляецца двойчы на тыдзень.

— Пачыналі з таго, што першыя дэзсродкі і сродкі індывідуальнай аховы купілялі за кошт прадпрыемства, — удакладняе намеснік начальніка аддзела ЖРЭУ Ленінскага раёна Магілёва Юрый ЦЫРУЛЬНІКАЎ. — Потым нам выдзелілі 50 тысяч рублёў з бюджэту. На гэтыя грошы закуплены дадатковыя дэзсродкі і сродкі індывідуальнай аховы. Прыцягваем для апрацоўкі пад'ездаў і вулічнага абсталявання рабочых па комплекснай прыборцы і ўтрыманні домаўладанняў. У сярэднім задзейнічаны 150 чалавек.

Аналагічная работа арганізаваная ў Кастрычніцкім раёне Магілёва, а таксама Бабруйску, райцэнтрах і іншых населеных пунктах вобласці.

На Магілёўшчыне таксама праводзіцца дэзынфекцыя вуліц, тратуараў, дзіцячых пляцовак і іншых аб'ектаў вулічна-дарожнай сеткі. Штодня арганізацыямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі вобласці робяцца справаздачы аб праведзенай рабоце.

Лічбы і факты

СТАЛІ БОЛЬШ АСЦЯРОЖНЫЯ

Як паўплываў каранавірус на жыццё беларусаў

Падчас пандэміі беларусаў усё больш сталі хваляваць пытанні эканомікі. Да такіх высноў прыйшлі эксперты падчас сустрэчы ў рамках праекта «Адкрыты дыялог па эканамічных рэформах», на якой спецыялісты прэзентавалі апошнія вынікі нацыянальнага апытання насельніцтва Беларусі. Эксперты расказалі, як пандэмія змяніла жыццё беларусаў і на якія меры з боку дзяржавы яны спадзяюцца.

Нават тыя людзі, што настроены больш аптымістычна, а гэта прыкладна каля 30 %, не чакаюць, што сітуацыя пачне выпраўляцца ў бліжэйшыя адзін-два месяцы. У цэлым траціна рэспандэнтаў упэўнена, што распаўсюджванне інфекцыі скончыцца да канца года. На першы план у параўнанні з сакавіком выйшлі хваляванні з нагоды эканамічных праблем: людзей турбуе, ці не знізяцца зарплаты, ці не павялічыцца беспрацоўе і ці не вырасце колькасць вымушаных адпачынкаў за свой кошт.

— COVID-19 увогуле значна паўплываў на лад жыцця жыхароў Беларусі, — адзначае **кіраўнік даследчых праектаў даследчай кампаніі SATIO Філіп БІКАНАЎ.** — У красавіку доля людзей, якія сталі прымаць меры засцярогі, сур'ёзна павялічылася ў параўнанні з сакавіком. Яны сталі часцей мыць рукі, карыстацца антысептыкамі, перасталі хадзіць на вуліцу без крайняй неабходнасці, радзей наведваюць крамы і карыстаюцца грамадскім транспартам. Напрыклад, калі ў сакавіку толькі 9 % гараджан выкарыстоўвалі маскі ў грамадскіх месцах, то ў красавіку колькасць такіх людзей вырасла да 48 %. Па сутнасці, кожны другі беларус пачаў насіць маску.

Штодзённасць мяняецца следам за паглыбленнем сітуацыі з каранавірусам. Пры гэтым жанчыны больш асцярожныя, чым мужчыны. Эксперты таксама заўважылі, што трывожнасць вышэйшая ў тых людзей, што маюць блізкага чалавека, які знаходзіцца ў групе рызыкі цяжэйшага цячэння хваробы.

У красавіку 52 % рэспандэнтаў заявілі, што іх даходы зменшыліся. Тыя, хто працуе ў сферы паслуг, кажуць, што ў іх стала менш заказаў і кліентаў, а тыя, хто працуе ў галінах прамысловасці, сутыкаюцца са скарачэннем колькасці рабочых дзён ці вымушанымі адпачынкамі за свой кошт. Пры чым людзі, якія працуюць на прыватных прадпрыемствах, часцей сутыкаюцца з падзеннем даходаў, чым тыя, хто заняты на дзяржпрадпрыемствах. 70 % рэспандэнтаў чакаюць, што дзяржава падтрымае абсалютна ўсе катэгорыі работадаўцаў незалежна ад формы ўласнасці і памеру.

Наогул беларусы ў пераважнай большасці (88 %) актыўна сочаць за навінамі, якія датычацца каранавіруса. У сярэднім каля паўгадзіны ў дзень яны выдзяляюць на маніторынг сітуацыі. Выбіраючы паміж двума распаўсюджанымі падыходамі да вырашэння праблемы з вірусам, большасць схіляецца да неабходнасці абмежавання сацыяльных кантактаў (65 %), чвэрць рэспандэнтаў лічыць, што найлепшы спосаб перажыць эпідэмію — гэта сфарміраваць калектыўны імунітэт.

Галоўныя меры, якія чакаюць беларусы ад дзяржавы, — забарона грамадскіх мерапрыемстваў, лепшае інфармаванне аб распаўсюджванні віруса, закрыццё на каранцін навучальных устаноў і перавод усіх магчымых рабочых месцаў на аддаленую работу.

Ініцыятыва, якую людзі лічаць самай важнай, — гэта дапамога пажылым, яе падтрымлівае палова рэспандэнтаў. Таксама важнымі лічаць збор сродкаў на куплю апаратаў ШВЛ (39 %), размяшчэнне медработнікаў у гасцініцах для мінімізацыі іх кантактаў з блізкімі (32 %) і сродкі засцярогі для медыкаў і сацыяльных работнікаў (31 %). Але аказалася, што ўсяго толькі 6 % насельніцтва непасрэдна брала ўдзел у спонсарстве або валанцёрстве. А вось бізнес у краіне больш актыўны ў гэтым кірунку.

Эксперты налічылі (па стане на 27 красавіка) больш за 160 ініцыятыў ад кампаній з самых розных сектараў. Даследчыкі ўпэўнены, што кампаніі з цягам часу будуць яшчэ больш актыўна падключацца да ініцыятыў.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

НОЧ ЗАЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Карэспандэнты «Звязды» падгледзелі, як рыхтаваліся да «Ночы музеяў — 2020» у літаратурным музеі Петруся Броўкі — філіяле Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

— Мы разумелі, што не можам прапусціць гэтае свята, якое ўсе музейшчыкі вельмі любяць, таму нават не разглядалі пытанне перанесці акцыю на восень, ды і невядома, што там будзе, — сустракае нас у ахоўнай амуніцыі **загадчыца філіяла Наталля МІЗОН.** — Вырашылі максімальна прытрымлівацца музейнай місіі: не прыдумляць піяр-акцыі, а паказаць менавіта тое, што мы сабой уяўляем, якія мы ёсць.

Адчуваючы сябе Магамедам, да якога не ідзе гара, каманда музея Петруся Броўкі прапанавала сваім заўсёднікам і выпадковым гасцям 16 мая застацца там, дзе яны пачуваюцца бяспечна і зручна, і прыйшла да ахвотных сама. Зразумела, не з пустымі рукамі, а з анлайн-праектам «Двайковы код», што ўключаў экскурсіі (у сацсетках і на YouTube) па пастаяннай экспазіцыі і часовай выстаўцы, літаратурную сустрэчу з Васілём Дранько-Майсюком, які расказаў у ZOOM пра беларускіх аўтараў-экспрэсіяністаў мінулага стагоддзя, а таксама некалькі новых ідэй.

Напрыклад, Вольга Уладыка, натхніўшыся штодзённай работай у музейным асяродку і паездкамі на радзіму паэта ва Ушаччыну, адлюстравала свае пачуцці ў малюнках — іх назбіралася на асобную выстаўку «Музейная імпрэсія». А Дарыя Карчашкіна сфатаграфавала... музейныя рукі — што і як яны робяць. Але, мабыць, найбольш цікавай стала прэзентацыя «Калі не цяпер, то праз 100 гадоў», якую правяла Наталля Мізон.

— У мяне спачатку была ідэя паказаць своеасаблівую кнігу рэкордаў музея — самую вялікую карціну, самы цяжкі прадмет, самы маленькі і гэтай далей, — прызнаецца Наталля Аляксандраўна. — Але дзяўчаты, якія працуюць з фондамі, прапанавалі іншае — расказаць пра прадметы, у якіх амаль няма шанцаў быць выстаўленымі на якой-небудзь экспазіцыі проста таму, што мы пра іх нічога не ведаем.

Сярод гэтых прадметаў — высушаны гранат, нібы маракас, у якім грукоча зерне. Адмыслова яго высушылі ў сям'і Пятра Броўкі ці проста забыліся з'есці, невядома. Альбо белая сава, якая «сядзела» ці то на шпяньку, ці на асадцы або алоўку. Керамічнае кашпо, якім відавочна не карысталіся. Міні-падушка — магчыма, жонка Пятра Усцінавіча скарыстоўвала яе для іголак, а магчыма, з нейкай іншай мэтай. Альбо вось накрыўка ад графіна — яна не падыходзіць ні да аднаго з сямі графінаў, што ёсць у калекцыі музея. Паўлінава пяро — адкуль яно прывезенае ці кім падоранае? Ці вось сувенірная рыбіна, зробленая з казінага ці каровінага рога, — у свой час такія сувеніры былі даволі папулярныя ў СССР, але адкуль менавіта гэты трапіў да паэта, пакуль што не ўстаноўлена. Шкляны каўпачок, знойдзены ўнутры іншага прадмета — прывезенага са Славакіі мядзведзя, які складаецца з дзвюх палавінак.

— Я была практычна ўпэўненая, што гэта адна з формаў медыцынскіх банек, пералапаціла «Гугл» і ўсе даступныя крыніцы, але нічога падобнага не знайшла, — расказвае дырэктар музея.

— А вы абвясціце сярод наведвальнікаў конкурс на лепшы варыянт тлумачэння, адкуль узяліся і для чаго выкарыстоўваліся гэтыя рэчы, — прапануем мы.



— Дарэчы, неблагая ідэя, — пагаджаецца Наталля Мізон, — магчыма, хтосьці будзе больш дасведчаны за мяне і раскажа падрабязнасці альбо прыдумае цікавыя гісторыі пра гэтыя рэчы.

Сярод іншых музейных артэфактаў нам паказваюць два патэфоны: дзіўны тэрмометр-ключ (1950-я гады), з Балгарыі — набор для ракіі (1968), з ГДР — капялюш-трылбі і брытву, якая «спявае» (1949) — нямецкая фабрыка Bonsawerk вырабляла такія з высакаякаснага сплаву, таму лязо пры галенні гучала ціхім прыемным шолахам, было ўпрыгожана гравіроўкай «Лісце і лаза» і пазначана канкрэтным лічбавым нумарам.

— З паездкі ў ЗША на 14-ю сесію Генеральнай асамблеі ААН пісьменнік прывёз, акрамя думкі, што толькі тады нацыя можа лічыцца нацыяй, калі мае ўласныя сцяг, герб, буквар і энцыклапедыю (менавіта пад яго кіраўніцтвам, нагадаем, была падрыхтавана першая нацыянальная дванаццацітомная Беларуская савецкая энцыклапедыя. — ***«Зв».***), таксама элегантныя замшавыя туфлі Citation для жонкі Алены, — расказваюць супрацоўнікі літаратурнага музея. — А ў Францыі для яе ж Пётр Усцінавіч набыў стылёвыя акуляры — між

што Савецкі Саюз нібыта не хоча гэтага кантролю (над раззбраенням. — ***«Зв».***)»...

— А вось паглядзіце, які цікавы пінжак, — звяртае нашу ўвагу Наталля Мізон, — гэта прататып смокінга. Такія ўвайшлі ва ўжытак у другой палове XIX стагоддзя дзякуючы прэм'ер-міністру Вялікабрытаніі Бенджаміну Дызраэлі і называліся «пінжакамі для палення» — функцыя іх была ў тым, каб воўна паглынула пах тытуню, а попел лёгка злятаў з атласных лацканаў і манжэт. Пятрусь Броўка скарыстоўваў гэты пінжак проста як дамашні халат, а да яго мы падабралі некаторыя іншыя рэчы, каб паспрабаваць уявіць, якім класік мог быць у нефармальнай абстаноўцы.

Паказалі нам і прадметы, з якіх, магчыма, усё ж будзе складзена кніга рэкордаў музея, — самая вялікая карціна, партрэт Петруся Броўкі аўтарства Уладзіміра Гардзіенкі (памер карціны — 180х160 см, з улікам рамы вышэй за чалавечы рост); самы цяжкі экспанат, радзіма паэта ва Ушацкім раёне ці ў доме на Карла Маркса, 30, дзе амаль 30 гадоў жыў народны паэт Беларусі.



адзін — чырвоны і бліскуча-прыгожы, хоць ты яго зараз у кіно альбо рэтракліпе здымай (дарэчы, і здымаюць), другі ўтойвае цікавую пласцінку — калі джаз у Савецкім Саюзе быў пад забаронай, нелегальныя копіі рабілі на рэнтгенаўскіх плёнках, і гэта якраз адзін з такіх запісаў, на якім бачны чыесьці рэбры.

— Гэты патэфон быў у адным з тых 17 чамаданаў асабістых рэчаў, якія ў 2016 годзе перадаў нам Юрый Пятровіч, сын Петруся Броўкі, — згадваюць супрацоўнікі музея.

Каля 20 чамаданаў, між іншым, таксама сталі часткай экспазіцыі — на часовай выстаўцы «З місіяй — у падарожжа», якая расказвае пра шматлікія вандроўкі пісьменніка, акадэміка і ўдзельніка многіх дэлегацый афіцыйных асоб і дзеячаў культуры СССР. Пятрусь Броўка аб'ездзіў мноства краін сацыялістычнага і капіталістычнага лагеру, і амаль з кожнага падарожжа прывозіў штосьці цікавае — нататкі, вершы і ўражанні для новых кніг, падарункі для блізкіх і сяброў, незвычайныя сувеніры. Вось, напрыклад, на памяць пра Швецыю пісьменнік прывёз

іншым, сёння акуляры той самай фірмы Frame France носіць Лэдзі Гага, аднак калі ў наш час гэта вінтаж, то паўстагоддзя таму — самы модны піск.

Вось імправізаваны чамадан-падарожнік — прыкладна такі набор з усім неабходным, ад акуляраў да сталовых прыбораў і праса, мог браць з сабою Пятрусь Броўка ў чарговую паездку. Асобнае месца на выстаўцы займае памятка для ўдзельнікаў савецкай дэлегацыі на Кангрэсе за раззбраенне і міжнароднае супрацоўніцтва, што праходзіў у Стакгольме ў 1958-м, — «неабходна прыняць усе меры да таго, каб былі выкрытыя сцвярджэнні пра тое, дыёла вагой 40 кілаграмаў, самая старая ўваходная група — мэбля даваеннага часу, дзе яшчэ відаць чырвоны аксаміт... Усяго ж на сёння ў фондах — паспрабуйце ўявіць — каля 25 тысяч прадметаў. А гэта значыць, што можна не абмяжоўвацца адной Ноччу музеяў, каб адкрыць для сябе Броўку з розных бакоў — пакуль што віртуальна (усе праекты будуць дасяжныя на анлайн-платформах), а потым непасрэдна ў музейнай прасторы — на радзіме паэта ва Ушацкім раёне ці ў доме на Карла Маркса, 30, дзе амаль 30 гадоў жыў народны паэт Беларусі.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении повторных электронных торгов	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	Воложинское районное потребительское общество, Минская обл., г. Воложин, ул. Партизанская, 30
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов
Месторасположение: Минская обл., Воложинский р-н

Наименование	Общая площадь	Инвентарный номер	Населенный пункт
Лот № 1			
Здание магазина № 97	51 кв. м	632/С-16054	Воложинский с/с, **д. Капустино**, 25А
Составные части и принадлежности: тамбур каркасно-засыпной, сарай дощатый			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0212** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 12.06.2117) для содержания и обслуживания здания магазина № 97. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона водных объектов, охранная зона электрических сетей (пл. 0,0078 га)			
Начальная цена лота №1 с НДС 20 % – 3 130,00 бел. руб. (снижена на 68 %)			
Лот № 2			
Здание магазина	47,8 кв. м	632/С-15108	Городьковский с/с, **д. Кащеличи,** ул. Глухая, 2
Составные части и принадлежности: блочная котельная, кирпично-блочный склад-сарай, блочный склад-сарай, уборная			
Сведения о земельном участке: пл. **0,0994** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 12.06.2038) для содержания и обслуживания здания магазина № 44. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона, охранная зона электрич. сетей (пл. 0,0073 га)			
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 2 860,00 бел. руб. (снижена на 54 %)			
Лот № 3			
Здание магазина № 56	57 кв. м	632/С-29415	Городьковский с/с, **д. Кутенята,** ул. Центральная, 6А
Составные части и принадлежности: пристройка, сарай пристройка, сарай			
Сведения о земельном участке: пл. **0,1225** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 19.06.2068) для содержания и обслуживания здания магазина № 56			
Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 3 110,00 бел. руб. (снижена на 48 %)			
Лот № 4			
Здание торгового центра «Универмаг»	3254,7 кв. м	632/С-27924	**г.п. Ивенец,** ул. 1 Мая, 8
Составные части и принадлежности: бетонный подвал, крыльцо			
Сведения о земельном участке: пл. **0,3637** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений торгового центра «Универмаг»			
Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 1 861 200,00 бел. руб.			
Лот № 5			
Двухэтажное кирпичное здание ресторана «Ислочь»	1439,7 кв. м	632/С-17403	**г. Воложин,** ул. Комсомольская, д. 4
Составные части и принадлежности: кирпичная пристройка, два навеса			
Сведения о земельном участке: пл. **0,2354** га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли – ресторана «Ислочь»			
Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 1 240 800,00 бел. руб.			
Лот № 6			
Здание магазина №156 «Универсам Раковский»	639,2 кв. м	632/С-24392	Раковский с/с, **аг. Раков,** пл. Свободы, 3
Составные части и принадлежности: крыльцо бетонное, забор из металлопрофиля на металлических столбах, пандус бетонный			
Сведения о земельном участке: пл. **0,1966** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания торгового центра. Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона			
Начальная цена лота № 6 с НДС 20 % – 1 368 700,00 бел. руб.			

Обременения: площади зданий по лотам № 4 и № 5 частично сданы в аренду. Лот №6 (здание магазина №156 «Универсам Раковский») сдан в субаренду ЗАО «Доброном» (срок действия по 27.09.2023). Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.04.2020

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов 03.06.2020 в 11.00.** **Окончание торгов 03.06.2020. в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 01.06.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении электронных торгов	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by
Продавец	Открытое акционерное общество «БПС Сбербанк», 220005, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов (транспортное средство, бывшее в употреблении):
легковой автомобиль NISSAN X-TRAIL, 2014 г. в., № кузова Z8NTBNT31DS139969, г. Минск, б-р Мулявина, 6

Начальная цена с НДС 20 %	**21 000,00 белорусского рубля**

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов: в течение 5 рабочих дней после заключения в установленном порядке договора купли-продажи автомобиля

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1 %** от цены продажи лота

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: начало торгов 10.00 22.06.2020. Окончание торгов 12.00 22.06.2020. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.06.2020г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

Извещение о проведении аукциона	
Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б
Продавец	ЗАО «АТЛАНТ», г. Минск, пр-т Победителей, 61

Предмет аукциона – имущество, реализуемое одним лотом, в следующем составе

Наименование, назначение	Общ. площадь	Инв. номер
Служебно-бытовой корпус с контейнерной площадкой (здание специализированное иного назначения)	970,8 кв. м	500/С-41498
Составные части и принадлежности: подпорная стена, площадка под мусоросборник, контейнерная площадка, площадка, контейнерная площадка, бордюр 0,16, лестница, въезд, бордюр 0,16		
Адрес: г. Минск, пер. Домашевский, 4		
Здание КПП (здание специализированное иного назначения)	23,1 кв. м	500/С-66398
Адрес: г. Минск, пер. Домашевский, д. 4, корп. 1		
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 31.01.2049 общей площадью 0,3156 га для обслуживания зданий специализированных иного назначения		
Начальная цена с НДС 20 %	**1 165 200,00 бел. руб.**	
Сумма задатка	**50 000,00 бел. руб.**	

Обременения: аренда. Более подробная информация на сайте www.cpo.by

Задаток перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок заключения договора купли-продажи: 20 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Дополнительная информация: победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, возмещает продавцу затраты по проведению рыночной оценки предмета аукциона **в сумме** 150,00 бел. руб.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**23.06.2020** в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата и время окончания приема документов	**19.06.2020** до 17.00 **по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИМУЩЕСТВА КПУП «Гомельоблтеплосеть», тел. 8 (0232) 35 00 67

№ лота	Наименование объекта	Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	– Часть помещений капитального строения площадью 61,9 кв. м, расположенных по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 7Б. Цель использования: для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, организации производства (кроме вредных производств). Срок договора аренды 3 года, арендная плата в месяц – 941,50 руб. с учетом НДС 20 %	235,38 руб.	23,54 руб.

Срок подачи заявления	По 17 июня 2020 г. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф.2-1
Дата, время и место проведения аукциона	19 июня 2020г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС- Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 19.05.2020 г.
Условия продажи	Шаг аукционных торгов – 10 %. Заключить договор аренды в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона

Для участия в аукционе необходимо представить

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация»

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ по продаже имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» информирует о проведении электронных торгов № 2020.Г.002.00007 по продаже имущества.
Продавец: государственное учреждение «Администрация свободной экономической зоны «Витебск». **Организатор, оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга».
Электронный адрес ЭТП: https://etpvit.by.
Дата и время проведения торгов: 19.06.2020 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Автомобиль VOLKSWAGEN CARAVELLE, 2012 г. в., кузов (рама) № WV2ZZZ7HZCH109762, цвет – серебристый металлик, тип ТС – микроавтобус вагон (WAGON), инв. № 01500004. Местонахождение имущества: г. Витебск, ул. 1-я Журжевская, 4. **Нач. цена:** 45 747,04 руб.

Извещение об электронных торгах опубликовано 19.05.2020 г. на сайте государственного комитета по имуществу http://gki.gov.by, на сайте Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by, на сайте электронной торговой площадки https://etpvit.by.
Контактные тел.: +375 (212) 42-60-11, +375 (29) 884-96-79, +375 (29) 391-09-56.

УНП 390477566

Камунальныя стасункі

ПРАВА НА ЯКАСЦЬ

ЯК ПРАД'ЯВІЦЬ ПРЭТЭНЗІЮ СЛУЖБАМ ЖКТ

Ужо амаль усе ведаюць, што калі існуюць пэўныя праблемы ў аказанні жыллёва-камунальных паслуг, то заўсёды можна звярнуцца ў службу «115». Але ж далёка не кожны разумее, як павінны дзейнічаць камунальнікі, калі да іх паступіла заяўка ці прэтэнзія ад спажыўца. Расказваем, што рабіць, калі вам няякасна аказалі паслугу.

bizlida.by

АБАВЯЗКОВАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ

Перш за ўсё трэба адзначыць, што ў Беларусі жыллёва-камунальныя паслугі падзяляюцца на асноўныя і дадатковыя. І калі ад дадатковых чалавек можа адмовіцца, то з асноўным блокам паслуг гэта немагчыма (акрамя такой паслугі, як санітарнае ўтрыманне дадатковых памяшканняў жылога дома). Да такіх паслуг адносяць тэхнічнае абслугоўванне жылога дома, бягучы і капітальны рамонт, халоднае і гарачае водазабеспячэнне, водаадвядзенне (каналізацыю), санітарнае ўтрыманне дадатковых памяшканняў жылога дома, газазабеспячэнне, электразабеспячэнне, цеплазабеспячэнне, тэхнічнае абслугоўванне ліфта і абыходжанне з цвёрдымі камунальнымі адходамі. Сярод дадатковых паслуг — установка і абслугоўванне дамафона, работа вахцёраў, арэнда і замена падлогавых газеахоўных дывановых пакрыццяў, відэаназіранне, уладкаванне прыдамавой тэрыторыі элементамі азеляненя, іх добраўпарадкаванне і далейшае ўтрыманне.

— Калі ж хоць адну з дадатковых паслуг камунальнікі не будуць аказваць ці будуць рабіць гэта з пэўнымі недахопамі, то спажывец заўсёды можа выказаць сваю прэтэнзію, — адзначае **першы намеснік генеральнага дырэктара ЖКГ Мінскай вобласці Павел ШЭЙПАК.** — Зрабіць гэта можна вусна праз службу «115» ці звярнуцца ў арганізацыю ЖКГ (вусна, праз пісьмовы ці электронны зварот, асабісты прыём. — **«Зв.»**). Пры гэтым вашу прэтэнзію павінны адразу ж зарэгістраваць, а спецыяліст мусіць паведаміць рэгістрацыйны нумар і назваць свае пасаду і прозвішча.

ЛІКВІДАЦЫЯ НЕДАХОПАЎ

Калі вы ўжо адправілі прэтэнзію любым зручным для вас спосабам, то на працягу дня да вас павінен прыйсці спецыяліст, каб устанавіць факт і прычыну няякаснага аказання жыллёва-камунальнай паслугі. Больш за тое, ён павінен скласці прэтэнзійны акт у двух экзэмплярах (адзін з іх застанецца ў вас). Там павінны быць адзначаны дата, від паслугі (як яе аказвалі і ў якім аб'ёме), метады правядзення абследавання і вынікі камісіі.

— Калі ж вы будзеце з чымсьці не згодны, то падпісаць прэтэнзійны акт вы заўсёды можаце са сваімі заўвагамі, — кажа Павел Мікалаевіч.

Калі паслугу сапраўды аказалі няякасна, то спецыялісты павінны ліквідаваць недахопы як мага хутчэй. Аднак кожны выпадак залежыць ад тэхналагічных магчымасцяў — выправіць недахопы могуць на працягу аднаго ці некалькіх дзён альбо ў тэрмін, прапісаны ў дагаворы (аднак не пазней чым праз месяц пасля прад'яўлення прэтэнзіі).

Напрыклад, калі ў вас цячэ дах, пашкоджаны ліфт ці дамафон, то рамонт павінны зрабіць на працягу сутак. Калі ў доме сапсавалі дзверы ці шкло ў вокнах, то летам гэтую праблему мусяць вырашыць за трое сутак, зімой — за суткі. А знадворны вадасцёк павінны адрамантаваць за пяць сутак. Экстранна вырашаць праблему работнікі абавязаны толькі ў аварыйных выпадках — напрыклад, калі была парушана цэласнасць знадворнай атынкоўкі, ёсць няспраўнасці аварыйнага характару ў сістэмах ацяплення, водазабеспячэння, каналізацыі, ёсць праблема з вентыляцыяй альбо здарылася нешта падобнае. Дарэчы, у такіх выпадках аварыйная брыгада павінна прыехаць да вас на працягу 30 хвілін.

НЕЗАЛЕЖНАЯ ПРАВЕРКА

Можа здарыцца і такое, што спецыялісты не ўстанавілі факт няякаснага аказання паслугі. У такім выпадку вам павінны даць ужо пісьмовы матываваны адказ на працягу пяці каляндарных дзён. Калі ж вы будзеце з гэтым не згодны, то заканадаўства дазваляе вам за свой кошт арганізаваць правядзенне незалежнай экспертызы якасці паслугі і абскардзіць адмову ў судзе.

— У гэтым выпадку можна звярнуцца ў любую спецыялізаваную арганізацыю, і праверку правядзе камісія, якая павінна будзе ўзгадніць з вамі дату і час правядзення экспертызы, і час доступу ў жылое памяшканне, — тлумачыць Павел Шэйпак. — Члены камісіі павінны будуць правесці неабходныя даследаванні і скласці акт незалежнай праверкі. Калі будзе пацверджаны факт аказання паслугі з недахопамі (ці паслугу нават ніхто не аказваў), то арганізацыя ЖКГ будзе не толькі абавязана ліквідаваць недахопы, але і павінна вярнуць вам грошы за правядзенне незалежнай экспертызы. Аднак калі недахопаў камісія не знойдзе, то грошы ніхто не верне.

ПЕРАРАЗЛІК АПЛАТЫ

Калі вам няякасна аказалі пэўную паслугу ці зусім не аказалі, то арганізацыя ЖКГ павінна будзе зрабіць перараслік аплаты. Для гэтага спажыўцу трэба будзе звярнуцца да камунальнікаў з заявай і прыкласці да яе прэтэнзійны акт, акт незалежнай праверкі ці судовай пастановы.

Напрыклад, перараслік могуць зрабіць, калі тэмпература паветра ў жылым памяшканні ніжэйшая за 18 °С на працягу сутак ці пітная вада не адпавядае якасці, якая ўстаноўлена санітарна-гігіенічнымі нормамі. Калі ж гаворка будзе ісці пра такія паслугі, як тэхнічнае абслугоўванне ці санітарнае ўтрыманне дадатковых памяшканняў жылога дома, то перараслік зробяць не толькі вам, але і вашым суседзям, якія таксама не атрымалі паслугу належнай якасці (у пад'ездзе, на паверсе і г. д.).

Валерыя КІСЛАЯ.

Сітуацыя

НУ І «НАКАПАЛА»...

Каля двух гадоў патраціў 70-гадовы жыхар Віцебска, каб даказаць, што камунальнікі няправільна налічылі плату за карыстанне вадой у яго кватэры. А жыхару Глыбокага за карыстанне вадой за дзесяць месяцаў налічылі... каля 223 рублёў. Пры гэтым лічыльнікі ў яго былі. Чаму так здарылася? Высветліў наш карэспандэнт.

Юрый Лукоўнікаў з абласнога цэнтра расказаў, што ў яго кватэры на праспекце Чарняхоўскага ў 2018-м былі знятыя для паверкі набытыя ім раней прыборы для ўліку вады. Работнікі арганізацыі водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі не прапанавалі яму на час паверкі ўстанавіць прыборы ўліку з абменнага фонду, а замест гэтага — так званыя ўстаўкі. Прыборы ўліку вярнулі больш чым праз дваццаць дзён.

У выніку за месяц, у якім праводзілася паверка прыбораў уліку, мужчыну прад'яўлена да аплаты 24 рублі 26 капеек — за спажыванне і адвядзенне каля 18,3 «куба». У тым ліку 12,9 рубля — за прыблізна 9,9 «куба», зыходзячы з тарыфаў, якія забяспечваюць поўнае пакрыццё выдаткаў камунальнікаў.

Калі прасцей: налічылі па сярэднім, так, быццам лічыльніка і не было. Для параўнання: за папярэднія месяцы па прыборах уліку ён плаціў у сярэднім па сем рублёў за пяць—шэсць «кубоў» вады.

Гараджанін куды толькі не звяртаўся, каб даказаць, што мякка кажучы, несправядліва да яго аднесліся. Сказаў, што ўпачатку з'ездзіў у камунальную арганізацыю, дзе пагаварыў з некалькімі супрацоўнікамі. У адказ пачуў, што падпісаў жа акт прыёмкі — пасля ўстаноўкі лічыльніка, дык чым незадаволены?

Суразмоўца прыгадаў, што са сваёй крыўдай звяртаўся і на «гарачую» лінію ЖКГ, да дэпутатаў. Адпіскі, у тым ліку з профільнага міністэрства, надакучылі — не тое слова, абуралі...

Амаль што расчараваны завітаў у Камітэт дзяржкантролю Віцебскай вобласці. Мужчына кажа, што там да яго праявілі павагу і не проста паабяцалі разабрацца, а давялі справу да лагічнага канца.

Дарэчы, з аналагічнай праблемай да кантралёраў звярнуўся жыхар Глыбокага. Там налічылі ажно 223 рублі.

53-гадовы пенсіянер МУС Валянцін Масальскі растлумачыў нашаму карэспандэнту, што летась яго чатыры лічыльнікі былі заменены. Яны каля дзесяці месяцаў функцыянавалі, але не былі ўлічаны, бо не была праведзена дзяржаўная метралагічная паверка прыбораў.

Мужчына таксама пісаў у розныя інстанцыі і атрымліваў незадавальняючыя яго адказы. Урэшце прыйшоў на выязны асабісты прыём грамадзян, у якім удзельнічаў кіраўнік абласнога Камітэта дзяржкантролю.

— Дзіўна, што пры разглядзе неаднаразовых абгрунтаваных скаргаў грамадзян у арганізацыі водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі не прымаўся пад увагу той факт, што іх віны ў сітуацыі, якая склалася, няма. А значыць і няма падстаў рабіць разлік платы як пры няўлічаным спажыванні па падвышаных нарматывах, — разважае **намеснік старшыні КДК Віцебскай вобласці Вадзім ВАЛОВІЧ.**

У Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі пагадзіліся з пазіцыяй Камітэта дзяржкантролю, што віны плацельшчыкаў паслуг у гэтым выпадку няма.

Пасля заканчэння тэрміну паверкі прыбораў уліку і пры адсутнасці віны спажыўца плата павінна налічвацца па сярэднім аб'ёме спажывання за два папярэднія месяцы, у якіх ажыццяўлялася плата па паказаннях прыбораў індывідуальнага ўліку.

У гэтай сувязі Камітэтам дзяржкантролю вобласці ўнесены абласному КУП водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі «Віцебскводаканал» прапановы аб правядзенні перараслiку паслуг водазабеспячэння. Спажыўцы будуць аплачваць паслугі з улікам сумы, што «авансавалі». Ім ужо перагледжаны памер налічанай платы за ваду.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Захаваць мінулае

Манументальныя сведкі гісторыі

Сёлета ў Ракаўскім прадмесці плануецца адкрыццё музейнай экспазіцыі, якая будзе прысвечана гісторыі Мінска ў савецкі перыяд. Пра гэта расказала начальнік аддзела мастацтваў упраўлення культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Наталля СМОЛЬСКАЯ:

— Цяпер там вядуцца рэстаўрацыйныя работы, аднак да Дня горада ў верасні экспанаты размесцяцца ў абноўленым будынку на вуліцы Ракаўская, 17, які ўваходзіць у спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў краіны, і экспазіцыя будзе даступна для наведвання.

Таксама ў сталіцы ўжо завершаны работы па манументальным аб'екце «Партызаны» на Партызанскім праспекце, ідзе рэстаўрацыя мазаічных пано на будынках мікрараёна Усход. Да таго ж рыхтуецца праект зоны аховы праспекта Незалежнасці, які прэтэндуе на статус аб'екта Спісу Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. «Цяпер архітэктары займаюцца вызначэннем меж праспекта і яго падрабязным апісаннем з уключэннем усіх аб'ектаў, а таксама нанясеннем атрыманай інфармацыі на ўсе неабходныя планы», — удакладніла Наталля Смольская.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Не сезон

На поўдні — забарона на лоўлю сома

З 19 мая ў рыбалоўных угоддзях Гомельскай і Брэсцкай абласцей пачне дзейнічаць забарона на лоўлю сома, якая працягнецца ў названых рэгіёнах да 20 чэрвеня. У іншых абласцях Беларусі аналагічная забарона будзе ўстаноўлена з 31 мая да 1 ліпеня. Забарона на лоўлю сома звязана з яго нерастам і з'яўляецца адной з мер аховы гэтага некалі чырванакніжнага віду.

Сом нерастуе пазней за іншых вясенненерастуючых рыб, пры добрым прагрэве вады. Ён спажывае малакаштоўную, хворую і загінулую рыбу, з'яўляецца біямеліяратарам вадаёмаў, ствараючы спрыяльныя ўмовы для развіцця здаровай іхтыяфаўны.

Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, незаконная здабыча адной асобіны сома падчас забароны абыдзецца парушальнікам у 12 базавых велічынь (324 рублі). Акрамя таго, на іх будзе накладзены адміністрацыйны штраф — да 50 базавых велічынь. А ў выпадку, калі шкода ад нелегальнай рыбалкі перавысіць 100 базавых велічынь, можа быць распачата крымінальная справа.

Разам з тым 18 мая ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях заканчваецца дзеянне агульнай забароны на лоўлю ўсіх відаў рыбы. З 19 мая ў гэтых рэгіёнах можна будзе рыбачыць з лодкі, з заходам у ваду, выкарыстоўваць адначасова некалькі снасцяў, займацца тролінгам і падводным паляваннем.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 1 (47)

«Гарачая» тэма

ВЫРОШЧВАЕМ ВІНАГРАД, АЛЕ ПАКУТУЕМ АД ЗАСУХ

Як клімат уплывае на сельскую гаспадарку

Сусветная метэаралагічная арганізацыя прызнала 2019 год адным з самых цёплых у свеце за ўсю гісторыю назіранняў. Спецыялісты ўпэўнены, такое хуткае змяненне клімату апярэджвае нашы здольнасці да адаптацыі і можа прывесці да сур'ёзных наступстваў.

Гісторыя інструментальных метэаралагічных назіранняў на тэрыторыі нашай краіны вядзецца з 1881 года. На працягу практычна ста гадоў адзначаліся натуральныя хістанні кліматычных параметраў, а з канца 1980-х пачалі інтэнсіўна праяўляцца сучасныя працэсы змены клімату. Рост тэмпературы паветра фіксуецца практычна ва ўсе сезоны года.

— Кожнае наступнае дзесяцігоддзе, пачынаючы з 1980 года, было цяплейшае, чым папярэдняе. Летась сярэднегадавая тэмпература паветра склала 8,8 градуса, што на два градусы вышэй за норму. Асноўныя прычыны такіх змяненняў — выкіды парніковых газаў, пераважна ў выніку спальвання выкапнёвага паліва, — адзначыў **начальнік Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Аляксандр КАНАВАЛЬЧЫК.**

Змяненне клімату негатыўна ўплывае на здароўе чалавека, прыводзіць да размнажэння розных пераносчыкаў захворванняў, напрыклад кляшчоў. Працяглая адсутнасць дажджоў у цёплы перыяд года вядзе да пажараў і, як следства, знішчэння лясных экасістэм і забруджвання паветра. Частыя засухі становяцца прычынай зніжэння ўраджайнасці сельгаскультур.

Дарэчы, сельская гаспадарка — адна з асноўных галін эканомікі, якая залежыць ад надвор'я. Павышэнне сярэднегадавой тэмпературы паветра ў Беларусі на адзін градус прывяло да зрушэння агракліматычных зон з поўдня на поўнач прыкладна на 150—200 кіламетраў. У нас ужо з'явілася чацвёртая агракліматычная зона, у якую ўваходзяць паўднёвая частка Брэсцкай і Гомельскай абласцей. Яна характарызуецца самай кароткай і цёплай у межах нашай краіны зімой і найбольш працяглым і цёплым вегетацыйным перыядам.

— Хутчэй за ўсё, да сярэдзіны стагоддзя працягласць перыяду актыўнай вегетацыі раслін павялічыцца яшчэ ў сярэднім на тры тыдні, у выніку чаго сума актыўных тэмператур у паўночнай частцы краіны дасягне значэнняў, якія цяпер характэрныя для поўдня. Такім чынам, сучасныя кліматычныя ўмовы, якія ўтварыліся ў новай агракліматычнай зоне, будуць назірацца ўжо на поўначы Беларусі, гэта значыць у Віцебскай вобласці. У той час як на вялікай частцы тэрыторый агракліматычныя параметры апынуцца блізкімі да сучасных умоў цэнтра Украіны і Сярэдняга і Ніжняга Паволжа, — падкрэсліла **намеснік начальніка службы гідралогіі і аграметэаралогіі Белгідрамета Кацярына ІСТОМІНА.**

Паводле слоў спецыяліста, з аднаго боку ў пацяпленні ёсць свае плюсы. Напрыклад, у Беларусі сталі вырошчваць культуры, якія раней былі нехарактэрныя для нашага рэгіёна (вінаград, кавуны і г. д.), павялічыліся пасяўныя плошчы кукурузы і рапсу. Аднак мінусаў усё ж значна больш.

— Здаецца, цёплыя зімы спрыяльна ўплываюць на перазімоўку культур, паколькі няма моцных маразоў, але з-за высокіх тэмператур яны не могуць знайсці стан спакою і працягваюць вегетацыю на працягу зімовага перыяду. Да таго ж рэзкія перапады тэмпературы, адсутнасць снегу прыводзяць да розных пашкоджанняў глебы на сельскагаспадарчых палетках, — дадала Кацярына Істоміна. — Таксама трэба адзначыць, што пацяпленне не вельмі добра ўплывае на традыцыйныя для нашага рэгіёна культуры, такія як бульба і лён, таму зараз мы перайшлі на больш раннія сарты бульбы.

Адным з самых негатыўных наступстваў змены клімату для сельскай гаспадаркі з'яўляецца рост паўтаральнасці засух, асабліва ў паўднёвых раёнах нашай краіны. Як запэўніваюць спецыялісты, раней засухі наступалі пераважна ў летні перыяд, цяпер жа гэта адбываецца ў больш раннія тэрміны. Напрыклад, у красавіку сёлета практычна не было ападкаў, што прывяло да моцнага высушвання глебы. Аднак, па словах метэаролагаў, майскія дажджы ўсё ж трохі палепшылі сітуацыю.

Кацярына КІРЭЕВА.

Актуальна

Тваё экалагічнае права

Мінпрыроды запрашае грамадскасць да ўдзелу ў нацыянальных кансультацыях па змесце Нацыянальнага даклада аб ажыццяўленні Орхускай канвенцыі.

Прыродаахоўнае ведамства пры ўдзеле шырокага кола зацікаўленых ведамстваў і грамадскасці распачало падрыхтоўку Нацыянальнага даклада аб ажыццяўленні Орхускай канвенцыі ў Рэспубліцы Беларусь (за перыяд 2017 – 2020 гадоў). Падчас яго падрыхтоўкі збіраецца і аналізуецца інфармацыя пра меры, прынятыя краінай у мэтах ажыццяўлення палажэнняў Канвенцыі, і пра іх эфектыўнасць з пункту гледжання дасягнення мэт гэтага міжнароднага дакумента ў адпаведнасці з рэкамендацыямі камітэта па пытаннях яго выканання ў дачыненні да нашай краіны.

Як расказалі ў прэс-службе Мінпрыроды, да ўдзелу ў нацыянальных кансультацыях па змесце Нацыянальнага даклада аб ажыццяўленні Орхускай канвенцыі запрашаецца і зацікаўленая грамадскасць. *Свае прапановы можна накіроўваць у Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь да 8 чэрвеня 2020 года на электронны адрас daspriroda@tut.by з пазнакай «Нацыянальны даклад». Кантактная асоба ў Мінпрыроды: намеснік начальніка ўпраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі Алена Меляшкова (тэл. 200-45-45).*

З папярэднімі дакладамі можна азнаёміцца на сайце Орхускага цэнтра Рэспублікі Беларусь http://aarhusbel.com/actual. Працэс падрыхтоўкі Нацыянальнага даклада аб ажыццяўленні Орхускай канвенцыі апісаны па спасылцы ў QR-кодзе.

* * *

Канвенцыя Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН «Аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў прыняцці рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях, што датычацца навакольнага асяроддзя» (Орхуская канвенцыя) была падпісана ў горадзе Орхусе (Данія) у 1998 годзе. У нашай краіне яна зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 1999 года № 726.

Задача Орхускай канвенцыі — гарантаваць правы на доступ грамадскасці да інфармацыі, удзелу ў працэсе прыняцця рашэнняў і на доступ да правасуддзя па пытаннях, якія датычацца навакольнага асяроддзя, каб забяспечыць правы кожнага чалавека сучаснага і будучых пакаленняў на жыццё ў спрыяльным навакольным асяроддзі.

Каб рашыць гэту задачу, бакі, якія падпісалі Канвенцыю, абавязаліся забяспечваць ажыццяўленне трох асноўных правоў:

✓ права на дасведчанасць: кожны чалавек мае права на атрыманне экалагічнай інфармацыі ад любога дзяржаўнага органа;

✓ права на ўдзел: грамадскасць (у тым ліку і кожны чалавек паасобку) павінна мець магчымасць браць удзел у прыняцці рашэнняў па канкрэтных відах экалагічнай дзейнасці, а таксама ў працэсе падрыхтоўкі планаў і праграм, праектаў нарматыўных дакументаў, звязаных з навакольным асяроддзем, падаючы грамадству неабходную інфармацыю;

✓ права на правасуддзе: кожны чалавек мае права на судовы разгляд выпадкаў адмовы ў падаванні экалагічнай інфармацыі ці ва ўдзеле ў прыняцці рашэння па пытаннях, звязаных з навакольным асяроддзем.

Вераніка КОЛАСАВА.

Экатэхналогіі

Пластык можна перапрацаваць, але лепш ад яго адмовіцца

Палова прадпрыемстваў грамадскага харчавання ўжо не выкарыстоўвае аднаразовы пластыкавы посуд

Адной з самых актуальных экалагічных праблем ва ўсім свеце з'яўляецца забруджванне навакольнага асяроддзя пластыкам. У нашай краіне ўрадам прыняты шэраг дакументаў, накіраваных на мінімізацыю выкарыстання гэтага матэрыялу ва ўпакоўцы розных тавараў і ў грамадскім харчаванні.

Згодна з экспертнымі ацэнкамі, 36 % пластыку, што вырабляецца ў свеце, — аднаразовая ўпакоўка. Таму 96 % гэтай упакоўкі адпраўляецца на звалку адразу пасля выкарыстання. Жыхары нашай краіны штогод выкідаюць 280 тысяч тон адходаў пластыку — гэта 29,4 кілаграма на аднаго чалавека.

❍ ЛІЧБЫ ДЛЯ РОЗДУМУ

Аб'ём стварэння палімерных адходаў у складзе камунальных адходаў налічвае каля 280 тыс. тон у год або 29,4 кг на аднаго жыхара, з якіх каля 140 тыс. тон — гэта адходы ўпакоўкі, што складаюць 14,7 кг на аднаго жыхара.

Летась сабрана і перапрацавана 97,2 тыс. тон (35 %) палімерных адходаў.

Патрэба ў аднаразовых пластыкавых вырабах у сектары грамадскага харчавання складае каля 200 млн адзінак у год, у прыватнасці, кубкі — 70 млн, накрыўкі для кубкаў — 23 млн, лыжкі — 23 млн, відэльцы — 20 млн, нажы — 19 млн.

Цяпер структура выкарыстання аднаразовага пластыкавага посуду ў аб'ектах грамадскага харчавання выглядае так: 18 % — выкарыстоўваецца выключна аднаразовы посуд, 32 % — выкарыстоўваецца разам са сталовым посудам, 50 % — не выкарыстоўваецца.

У Беларусі для зніжэння колькасці пластыкавых адходаў рэалізуецца план мерапрыемстваў, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 студзеня 2020 года № 7, накіраваны на паэтапнае зніжэнне выкарыстання палімернай упакоўкі з замяшчэннем яе на экалагічна бяспечную ўпакоўку. У аб'ектах гандлю рознага фармату прадугледжана абавязковая наяўнасць безалкагольных напояў у шкляной тары, а таксама папяровых пакетаў, аднаразовага посуду і сталовых прыбораў з паперы, мінімізавана колькасць разнавіднасцяў пластыкавых пакетаў і посуду.

З 1 студзеня 2021 года ў аб'ектах грамадскага харчавання забаронена выкарыстоўваць і прадаваць некалькі відаў аднаразовага пластыкавага посуду: палачкі для размешвання напояў, кубкі і шклянкі, талеркі, трубачкі (саломінкі) для напояў, упакоўку для прадукцыі грамадскага харчавання і харчовых прадуктаў (кантэйнеры, латкі, скрынкі, ланч-боксы, банкі, бутэлькі), за выключэннем упакоўкі для паўфабрыкатаў, кулінарных і кандытарскіх вырабаў. І самае галоўнае, у краіне пашыраецца вытворчасць экалагічна бяспечнай упакоўкі.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

Экалогія і закон

Бурым свідравіны па правілах

Каб пітная вада не прыбавіла клопату, важна здабываць яе з улікам прыродаахоўнага заканадаўства

Вясной многія гаспадары сядзіб і дачнікі задумваюцца аб тым, каб мець на ўласным участку ваду. Для гэтага неабходна замовіць бурэнне свідравіны. Як гэта правільна зрабіць, расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення прыродных рэсурсаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Васіль КОЛБ.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Якія патрабаванні прад'яўляюцца да фізічных асоб, што жадаюць мець свідравіну на сваім зямельным участку?

— На ўласным зямельным участку грамадзянін мае права ажыццяўляць бурэнне свідравіны і выкарыстоўваць падземныя воды без атрымання дазволу. Хоць жорсткіх абмежаванняў тут няма, усё ж трэба прытрымлівацца правілаў, выконваючы якія, чалавек зможа засцерагчы сябе. Сёння паслугі па бурэнні свідравін прапануюць розныя арганізацыі, якія можна падзяліць на дзве групы: прафесіяналы і «самадзейнасць».

У штаце прафесійнай арганізацыі абавязкова будзе геолаг, які вывучыць мясцовасць, геалагічны разрэз, узровень залягання падземных водаў, а таксама пацікавіцца, ці ёсць у суседзяў свідравіна або студня і як яны размешчаны. Просты прыклад: у вашага суседа калодзеж глыбінёй 10 метраў, а на вашым участку прабурылі свідравіну на такой жа глыбіні. Праз нейкі час вады ў калодзежы не будзе — яе выцягне помпа, усталяваная для свідравіны. Магчыма, сусед будзе грашыць на клімат, але не выключана, што і здагадаецца, адкуль прыйшла бяда. Калі ж праектаваць свідравіну будзе спецыяліст, такая сітуацыя выключана.

Другі важны момант — тэхніка, якой карыстаецца арганізацыя. Работнікі павінны валодаць дастатковай кваліфікацыяй і мець допуск да работы на патэнцыйна небяспечных аб'ектах, якімі з'яўляюцца свідравіны глыбіней больш за 20 метраў. Па завяршэнні ўсіх работ арганізацыя абавязкова выдае заказчыку пашпарт на свідравіну.

— А калі гаворка ідзе пра садовае таварыства, які там парадак дзеянняў?

— Яно з'яўляецца юрыдычнай асобай, рашэнне аб бурэнні свідравіны прымаецца на агульным сходзе. У такіх выпадках здабыча падземных водаў складае, як правіла, больш за пяць кубаметраў у суткі, таму трэба атрымаць спецыяльны дазвол на водакарыстанне.

Прымітыўна схему можна ўявіць так: ад вялікай трубы ідуць адгалінаванні на ўчасткі для падачы (транспарціроўкі) вады, на іх устанаўліваюцца лічыльнікі, і кожны член СТ плаціць у адпаведнасці з іх паказаннямі.

— Васіль Юр'евіч, растлумачце, у чым практычная неабходнасць мець пашпарт на свідравіну.

— Пашпарт — гэта дакумент, у якім пазначаны ўсе тэхнічныя характарыстыкі свідравіны. Ён афармляецца ў трох экзэмплярах: адзін — уласніку свідравіны, другі — у тэрытарыяльны орган Мінпрыроды і трэці — у Белдзяржгеацэнтр для захоўвання ў дзяржаўным геалагічным фондзе.

Захоўваць пашпарт трэба ўвесь перыяд эксплуатацыі свідравіны. Калі ён згублены, копію можна атрымаць у Белдзяржгеацэнтры.

Трэба разумець, што свідравіна — аб'ект нерухомасці, на які можа запатрабаваць дакументы рэгіянальнае агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры, а таксама землямер.

— Ці ёсць участкі, на якіх нельга бурыць свідравіны?

— Гэта асабліва ахоўныя прыродныя і іншыя тэрыторыі, дзе карыстанне нетрамі забаронена або абмежавана. На тэрыторыях, забруджаных радыенуклідамі, альбо ўведзена забарона на бурэнне свідравін, альбо існуюць іншыя абмежаванні. Не рэкамендуецца праводзіць такія работы паблізу жывёльных могільнікаў, могілак, звалак, прыбіральняў і г. д. Відавочна, што рана ці позна вада ў гэтых месцах будзе забруджана.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

Грамадская ініцыятыва

Заняткі спортам на карысць прыродзе

Мінпрыроды заклікае не забываць пра навакольнае асяроддзе падчас пандэміі

Нягледзячы на тое, што многія грамадскія мерапрыемствы адмяняюцца, кожны з нас можа дапамагчы прыродзе самастойна. Напрыклад, сумясціць прабежкі са зборам смецця.

Па ўсёй краіне працягваецца экалагічная кампанія «Добраўпарадкуем малую радзіму!», далучыцца да якой могуць усе ахвотныя. Кампанія ідзе з 2018 года і ўключае ў сябе розныя мерапрыемствы: пасадку дрэў, уборку смецця, добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, дзіцячых пляцовак, экалагічных сцежак і г. д.

— У сакавіку — красавіку можна было ўзяць удзел у азеляненні тэрыторый, — расказала **намеснік начальніка ўпраўлення аналітычнай работы, навукі і інфармацыі Мінпрыроды Алена МЕЛЯШКОВА.** — Калі вы таксама хацелі б пасадзіць дрэва, то восенню, калі адновяцца гэтыя работы, неабходна будзе патэлефанаваць у тэрытарыяльны орган Мінпрыроды — абласны камітэт ці раённую інспекцыю — і прапанаваць месца, якое вы хочаце азеляніць. Калі яно прыдатнае па розных параметрах, будзе арганізавана пасадка. Пры гэтым мы прапануем ахвотным самім браць удзел у такіх мерапрыемствах. Увогуле дапамога грамадзян, юрыдычных асоб у рабоце па навядзенні парадку мае для нас вельмі вялікае значэнне. Мінпрыроды вітае і гатова аказаць садзейнічанне кожнай з экалагічных акцый і ініцыятыў грамадскасці.

Так, можна ўзяць удзел у забегах плогераў. Год таму ў нашай краіне стартаваў праект Plogging Belarus, які прапануе ўсім ахвотным сумясціць карысныя заняткі — умацаваць сваё здароўе і дапамагчы прыродзе. І хоць зараз усе мерапрыемствы праекта адменены, яго каманда прапануе «плогіць» самастойна і выкладваць свае фатаграфіі ў сацыяльныя сеткі з хэштэгамі #plogging #ploggingbelarus, каб дзяліцца матываціяй з іншымі!

— Калі будзе магчыма, плануем зрабіць тур па невялікіх гарадах і правесці забегі там. Верагодна, пачнём з пяці гарадоў, а калі ўсё пойдзе паспяхова, пашырым геаграфію. Вядома, хочацца дабіцца таго, каб людзі займаліся плогінгам і без нашых забегаў, асабліва цяпер, таму ўсіх заклікаем да гэтай карыснай справы! — адзначыў **арганізатар праекта Аляксандр БЕЎЗ.**

Сёння плогінг — гэта папулярны экалагічны рух, але яшчэ тры гады таму пра яго ніхто не ведаў. Усё пачалося ў Швецыі з неабыякавых людзей, якія на прабежцы збіралі смецце і затым выкладвалі яго фатаграфіі ў сацыяльныя сеткі, каб прыцягнуць увагу да праблемы. Экаактывіст Эрык Альстром вырашыў зрабіць гэтыя забегі арганізаванымі і запусціў праект Plogga. Пасля чаго да руху далучылася больш за 40 краін.



Першы плогінг-забег у Мінску прайшоў у мінулым годзе 1 мая. Усяго летась адбыліся чатыры забегі, падчас якіх энтузіясты сабралі амаль 1400 кілаграмаў смецця. Тое, што было магчыма, здалі на перапрацоўку.

Кацярына ЦІТОВА.

Далучайцеся!

Раскажы пра сваю крыніцу

Стартуе конкурс на найлепшыя работы па інвентарызацыі крыніц малой радзімы

У лістападзе ў Мінску адбудзецца VI Міжнародны водны форум «Крыніцы Беларусі». У падрыхтоўцы гэтай падзеі можа прыняць удзел кожны з нас, сабраўшы інфармацыю пра мясцовую крыніцу.

ХТО АРГАНІЗАТАР

У рамках інфармацыйнай кампаніі «Раскажы пра сваю крыніцу» РУП «Цэнтральны навукова-даследчы інстытут комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў» праводзіць конкурс на найлепшыя работы па інвентарызацыі крыніц малой радзімы.

КАЛІ І ХТО МОЖА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ



Тэрмін правядзення конкурсу: 5 чэрвеня — 15 ліпеня 2020 года. Удзельнічаць могуць усе ахвотныя: мясцовыя жыхары, школьнікі, педагогі, маладзёжныя і грамадскія арганізацыі.

ШТО ТРЭБА РАБІЦЬ

— Правесці абследаванне крыніцы самастойна альбо сумесна з прадстаўніком раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Сабраць неабходную інфармацыю: дата правядзення абследавання крыніцы; апісанне яе месцазнаходжання (вобласць, раён, найбліжэйшы населены пункт); фатаграфіі крыніцы (3 фота з розных ракурсаў абавязкова ў фармаце JPG/JPEG); геаграфічныя каардынаты месцазнаходжання (можна выкарыстоўваць мабільны тэлефон); дэбіт крыніцы (літры/секунду, дапускаецца вымярэнне без прымянення спецыялізаванага абсталявання); апісанне актуальнага стану крыніцы (абсталяваная, добраўпарадкаваная, засмечаная).

Пералік крыніц для абследавання будзе размешчаны на сайце РУП «ЦНДІКВВР» www.cricuwr.by да пачатку конкурсу. Там жа можна знайсці шэраг метадычных рэкамендацый і прыклад афармлення работы па абследаванні крыніцы.

— Адпраўіць работу арганізатару конкурсу на электронную пошту (mail@cricuwr.by). Не забыцца пазначыць кантактную інфармацыю ўдзельніка (імя, прозвішча, актуальны нумар тэлефона, адрас электроннай пошты, паштовы адрас для перапіскі). А таксама будзе вельмі добра, калі звесткі пра сваю крыніцу ўдзельнікі конкурсу накіруюць у сродкі масавай інфармацыі і сацыяльныя сеткі зц хэштэгам #родникибеларуси_минприроды, каб як мага болей людзей даведалася пра цікавы водны аб'ект.

ДЛЯ ЧАГО ПРАВОДЗІЦЦА КОНКУРС

Мэта кампаніі «Раскажы пра сваю крыніцу» — сфарміраваць цікавасць мясцовых жыхароў да абследавання, добраўпарадкавання і аховы водных аб'ектаў пад эгідай Сусветнага дня навакольнага асяроддзя і кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму!».

ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ

Вынікі інфармацыйнай кампаніі «Раскажы пра сваю крыніцу» будуць падведзены 3—4 лістапада 2020 года падчас VI Міжнароднага воднага форуму «Крыніцы Беларусі», які пройдзе ў Мінску. Пераможца конкурсу будзе вызначаны па найбольшай колькасці абследаваных крыніц, пры гэтым асобна ўлічваецца колькасць упершыню выяўленых і абследаваных, не уключаных раней у пералік.

Сярод дасланых работ арганізатарам конкурсу таксама будуць адабраны 10 найлепшых фатаграфій крыніц. Іх змесцяць у ілюстраваным выданні «Крыніцы Беларусі» з абавязковым указаннем прозвішча аўтара. Аўтары 10 найлепшых фотаздымкаў будуць узнагароджаны падарункавымі асобнікамі кнігі «Крыніцы Беларусі», выданне якой запланавана на жнівень 2020 года. Пераможца і прызёры конкурсу будуць узнагароджаны каштоўнымі і памятнымі падарункамі, у тым ліку падарункавым асобнікам кнігі «Крыніцы Беларусі». Для педагогаў і школьнікаў, маладзёжных і грамадскіх арганізацый, якія прынялі ўдзел у конкурсе, прадугледжаны лісты з падзякай, іх накіруюць адміністрацыі навучальнай установы/грамадскай арганізацыі.

Інга ГАРДЗЕЕВА.

Фота РУП «ЦНДІКВВР».

Извещение о проведении повторных электронных торгов

Общество с ограниченной ответственностью «ИПМ-Консалт оценка», организующее электронные торги на основании договора поручения, извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **обществу с ограниченной ответственностью «Волес Юнион» (УНП** 192022460), в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 600-26Б/2019 в экономическом суде города Минска

Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов – дебиторская задолженность

№ лота	Кредитор	Дебитор	Сумма дебиторской задолженности	Начальная цена (без НДС)	Минимальная цена (без НДС)
1	ООО «Волес Юнион»	ООО «АРКАДИЯ-ТЕКС» (г. Москва, пр-т Мира, д. 131, оф. 3, ОГРН 5137746157621, ИНН 7717770567, КПП 771701001)	4 817 865,00 рос. руб.	3 372 505,50 рос. руб. (снижена на 30 %)	2 408 932,50 рос. руб.
2	ООО «Волес Юнион»	ОАО «Смиловичская валяльно-войлочная фабрика» (УНП 600011780)	51 135,95 бел. руб.	35 795,18 бел. руб. (снижена на 30 %)	25 567,99 бел. руб.

Размер шага составляет **5 (пять) процентов** от начальной цены лота

Имеющиеся обременения в отношении имущества: отсутствуют

Задаток **10 %** (по лоту № 1 – по курсу НБРБ на дату платежа) от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка».

Срок подписания договора купли-продажи	**10** (десять) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется постановлением Министерства экономики № 9 от 1 апреля 2019 года «Об электронных торгах по продаже имущества в процедурах экономической несостоятельности (банкротства)»

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 5 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 10.04.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов 05.06.2020 в 9.00. Окончание торгов 05.06.2020 в 16.00**
Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 03.06.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**
Контактные телефоны	**+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by**

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – продавец (организатор аукциона) 15 июня 2020 года в 15.00 проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена продажи со снижением на 20 % без НДС бел. руб.	Местонахождение имущества	Сумма задатка, бел. руб.
Лот № 1	Бульдозер «ДЗ-110», тип ТС – бульдозер гусеничный, 1988 г. в.	5040,00	Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 156	504,00
Лот № 4	Прицеп «2 ПТС-4.5», тип ТС – прицеп тракторный, 1998 г. в.	1200,00		120,00
Лот № 5	Здание мобильное «М-К1-3», тип ТС – прицеп, 2000 г. в.	1360,00		136,00

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: 15 июня 2020 в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121119410119330000, код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «БПС-Сбербанк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 12.06.2020 г.; время: 17.00.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона.

8. Извещения о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размешены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Тимирязевский» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **одним лотом имущества в составе:**

склад материалов с инв. № 642/С-39075 общ. пл. 293,5 кв. м;

здание склада ГСМ с инв. № 642/С-39076 общ. пл. 20,8 кв. м;

мастерские с инв. № 642/С-39077 общ. пл. 241,3 кв. м;

механические мастерские *(составные части и принадлежности: 2 пристройки)* **с инв. № 642/С-39078 общ. пл. 1 138,8 кв. м;**

склад ГСМ с инв. № 642/С-39079 общ. пл. 26,3 кв. м (далее – объекты).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 622881707601000152 площадью 1,9263 га (право аренды по 27.01.2050) по адресу: Минская область, Копыльский район, Бучатинский с/с, 7, вблизи д. Смоличи. *Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки, водоема, пл. 1,9263 га; охранная зона электрических сетей, пл. 0,0283 га; придорожная полоса автомобильной дороги, пл. 0,0866 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **59 365,98** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **5 936,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121 082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи, на депозитный счет Министерства юстиции Республики Беларусь. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **24.06.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.06.2020** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

УНН 600018425

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 2 июля 2020 года проводит 9-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
88	Перекачивающая станция горючего ПСГ-160 (431410) скл.с/о 169 на «ЗИЛ–431410» ш. 3146805 дв. 829968 1991 г. 4 кат. 1005 км 3,5 м/ч	н. п. Михановичи, в/ч 52188	6 700,00	1 340,00
89	Специальный автомобиль «Урал-43203-01» с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 12108 1989 г. 4 кат. Автошасси «Урал-43203-01» ш. 135577 дв. 522109 1989 г. 3 кат. 1450 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	9 500,00	1 900,00
90	Специальный автомобиль «Урал-43203-01» с кузовом-фургоном К2-4320 в составе: кузов-фургон К2-4320 № 08130 1990 г. 4 кат. Автошасси «Урал-43203-01» ш. 154485 дв. 652205 1990 г. 3 кат. 780 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	9 500,00	1 900,00
91	Специальный автомобиль «КамАЗ-43101» с кузовом-фургоном К1-4320Д в составе: кузов-фургон К1-4320Д № 091944 1989 г. 4 кат. Автошасси «КамАЗ-43101» ш. 0004948 дв. 0492805 1989 г. 3 кат. 1718 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	10 000,00	2 000,00
92	Специальный автомобиль «КамАЗ-43101» с кузовом-фургоном К1-4320Д в составе: кузов-фургон К1-4320Д № 050888 1990 г. 4 кат. Автошасси «КамАЗ-43101» ш. 0015653 дв. 0616565 1990 г. 3 кат. 2057 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	10 000,00	2 000,00
93	Специальный автомобиль «КамАЗ-43101» с кузовом-фургоном КБ2-4320Д в составе: кузов-фургон КБ2-4320Д № 050579 1990 г. 4 кат. Автошасси «КамАЗ-43101» ш. 0013104 дв. 0590984 1990 г. 4 кат. 2002 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	10 000,00	2 000,00
94	Специальный автомобиль «Урал-375» с кузовом-фургоном К1-375 в составе: кузов-фургон К1-375 № 09023 1983 г. 4 кат. Автошасси «Урал-375» ш. 408287 дв. 978343 1983 г. 4 кат. 1142 км	г. Осиповичи, в/ч 01313	7 000,00	1 400,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **2 июля 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 29 июня 2020 года.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **2 июля 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 бел. руб. за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:

белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» №30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС. Справки по тел./факс: (017) 398 05 41.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Копыльский райагросервис» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже **навеса для автомашин** *(составные части и принадлежности: пристройка)* **с инв. № 642/С-11079 общей площадью 799,3 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622850100001002687 площадью 0,2179 га (право аренды по 25.11.2039) по адресу: Минская область, г. Копыль, ул. Промышленная, 3/3.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании зоны санитарной охраны водозабора пл. 0,2179 га.

Начальная цена объекта с НДС (20 %) – 231 600,00 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (23 160,00 бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121 082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **23.06.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.06.2020** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: 8 (017) 207-71-34, 8 (029) 102-21-17.**

УНН 600018956.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 01.06.2020 открытого аукциона

Лот № 1: зерносушильный комплекс СЗШ-16 (СЗУ-16, инв № по бух. учету 0225), г. в. 2005, производительность по пшенице продовольственного назначения – 16 т/ч, установленная мощность – 60,8 Квт.
Начальная цена продажи: 43 650,00 бел. руб. с учетом НДС.
Сумма задатка: 4 365,00 бел. руб.

Аукцион состоится 1 июня 2020 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 29.05.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для внесения задатка: получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: КСУП «Самотевичи Агро», УНП 700004212, аг. Новые Самотевичи, Костюковичский район, Могилевская область

Срок и условия оплаты: победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 03.04.2020 г.

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Доп. информацию можно получить по тел.: **+375 222-72-41-14, +375 29-624-26-25, +375 29-550-09-56** и на сайте **ino.by**

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что в связи с уменьшением с 20.05.2020 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь на 0,75 процентных пункта до 8,0 процентов годовых, с **21.06.2020** ОАО «Белагропромбанк» уменьшает на 0,75 процентных пункта плавающие процентные ставки по договорам банковского вклада «Универсальный» и «Сберегательный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006. Также, в соответствии с условиями договора, пролонгация вклада «Стабильный» осуществляется на условиях применения процентной ставки для данного вида вклада (депозита), действующей на день продления договора.

Лицензия на осуществление банковской деятельности
№ 2 от 13 февраля 2019 года
выдана Национальным банком Республики Беларусь.
УНП 100693551.

Утерянные представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному медицинскому страхованию иностранных граждан формы 2РН, серии БВ № 3376769 **считать недействительными.** УНП 100122726.

РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ГВТУП «БЕЛВНЕШПРОМСЕРВИС» (Продавец). Лот № 1:** легковой седан «ТОЙОТА КЭМРИ», кузов JTNBK40K703045197, г. в. – 2008, цвет – серебристый металлик. **Местонахождение:** г. Минск, ул. Казинца, д. 2. **Начальная цена с НДС** – 14 880,00 руб. Аукцион состоится **09.06.2020 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Извещение о проведении повторного аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора аукциона ino.by

УНП 190055182.

Аналізуем гэта

ПРЫЗНАЙЦЕ ЎЖО, НАРЭШЦЕ, СТАРАСЦЬ

Так, вы не такія, як раней, але гэта не падстава для дэпрэсіі

Калі мне кажуць, што ўзрост — гэта проста лічба ў пашпарце, я ў адказ думаю (услых, вядома, не кажу), што чалавек, які мне так сказаў, або недалёкі, або базлівы настолькі, што стараецца гнаць ад сябе ўсе думкі аб гэтай лічбе, ці, як варыянт, ён проста няшчыры. Таму што, хоць у душы вы і можаце адчуваць сябе вечна маладым, усё ж законы фізіялогіі ніхто не адмяняў, і з гэтага пункту гледжання ўзрост — гэта ўсё ж не проста лічба.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Старэць цяпер не модна, а модна і прэстыжна паказваць, што ты амаль нічым не адрозніваешся ад маладых — ні сваім адзеннем, ні паводзінамі, ні спосабам жыцця. Але збоку такія «перабежчыкі» ў чужы лагер, на жаль, часцей за ўсё выглядаюць проста вартымі жалю. Таму што ніякая мода не мае ўлады над законамі прыроды. Прызнайце ўжо, нарэшце, што вы, я, ён, яна — усе мы старэем. І гэта зусім не сорамна!

Як прыходзіць старасць? Напэўна, пакуль сам не станеш пажылым, не даведаешся, як гэта.

Тыя, хто ўжо праходзіць гэты жыццёвы этап, адзываюцца па-рознаму. Хтосьці (не памятаю, хто) напісаў: «Старасць як зіма. Аднойчы прачынаешся і бачыш, што ўсё пабялела». Але, напрыклад, пісьменнік Валянцін Акудовіч з гэтым не згодны. Летась я даволі выпадкова трапіла на адну з яго лекцый, на якой гэты «бадзёры песіміст», разважаючы на тую ж тэму, сказаў: «У старасць уваходзіш павольна. Акунаеш у яе, як у халодную ваду, спачатку пятку, потым пакрысе акунаешся ўвесь». І далей: «Чым даўжэй жывеш, тым больш табе патрэбна мужнасць... У вернікаў, асабліва ў сталыя гады, ёсць перавага...»

* * *

Дык чаго мы баімся, калі баімся старасці?.. Мы ўсе ведаем гэтыя прыкметы: з'яўляюцца маршчыны, сівізна. Косткі становяцца больш крохкімі. Памяншаецца тонус. У імуннай сістэме горш выпрацоўваюцца антыцелы, хваробы «прыліпаюць» часцей, а вылечыць іх складаней. З часам пачынае падводзіць памяць...

Так, мы ведаем усё гэта, але на самай справе, пакуль яшчэ маладыя, мы проста не ў стане ўявіць сабе фізічныя аспекты ўзросту. «Гэта пастаянны боль у каленях з-за артрыту, паступовае пагаршэнне зроку і слыху і ўсё больш частая страта раўнавагі, — кажа мая 71-гадовая знаёмая. — Аднак гэта ўсё не палохае, таму што развіваецца не раптоўна, а з часам. І ты прывыкаеш да гэтых паступовых зменаў...»

А як наконт таго, што «ў душы я такая ж, якой была ў 30»? А ніяк. Таму што на самай справе — не, не такая ж.

Тыя, хто сцвярджаюць, што ўнутры яны зусім не змяніліся, — успомніце сябе 5–10–20 гадоў таму. Як вы бавілі вольны час? Пра што марылі, да чаго імкнуліся? Якія ў вас былі звычкі? Якія песні, кнігі і фільмы падабаліся? Калі вы падрабязна прааналізуеце ўсё гэта, то не выключана, што самі здзівіцеся.

Бо, напрыклад, навукоўцы высветлілі, што з узростам людзі ў сярэднім становяцца ў большай ступені інтравертамі і менш хочуць заводзіць новыя знаёмствы, імкнуцца праводзіць больш часу з сям'ёй і старымі сябрамі. У цэлым, яны больш свядомыя, рахманыя і эмацыянальна стабільныя, чым маладыя людзі. З іншага боку, маладыя больш адкрытыя для новага вопыту і ў большай ступені зацікаўлены ў знешнім, вонкавым поспеху.

Далей: нягледзячы на распаўсюджаны стэрэатып пра незадаволенасць старэйшага пакалення, чым старэйшы чалавек, тым ён больш добразычлівы. Хоць, з іншага боку, старасць выводзіць наверх і ўсе «плямы» характару. Прычым усе ўзроставыя змены характару адбываюцца незалежна ад полу і ўзроўню адукацыі людзей.

Таму, хоць нам можа здавацца, што мы ўсё жыццё застаёмся самімі сабой, навука кажа пра адваротнае. Самае працяглае даследаванне чалавечага характару доўжылася 63 гады. І яно паказала, што характар аднаго і таго ж чалавека ў 16 гадоў і ў 65 — не мае амаль нічога агульнага.

* * *

Так што, яшчэ раз, узрост — гэта не проста лічба. Казаць адваротнае, не суадносіць гэтую самую лічбу з сабой — па сутнасці значыць саромецца яе і ў глыбіні душы лічыць сябе больш недасканалымі, чым раней, калі былі маладзейшыя. І гэта адбываецца таму, што грамадства, усе вакол менавіта так на самай справе і лічаць, нават калі ўслых кажуць іншае. Так, цяпер пажылыя патроху выходзяць з ценю. На подыумах усё часцей з'яўляюцца ўзроставыя мадэлі. Але іх твары — звычайна вынік намаганняў хірургаў, апранутыя гэтыя людзі як падлеткі і з усіх сіл дэманструюць, як яны не адстаюць ад часу. Тут — усё тое ж адмаўленне старасці, заклік караскацца ўверх, нават калі здзіраеш пазногці да крыві. «Старасць — задворкі жыцця, усё добрае ўжо ў мінулым...» Той, хто жыве з такой установай, хай і неўсвядомленай, вядома, з усёй моцы будзе гнацца за штучнай маладосцю.

Зноў жа пытанне: калі яна надыходзіць, гэтая самая старасць? І ці праўда, што сённяшнія 70 — гэта ранейшыя 50?

У розных краінах свету людзі разыходзяцца ў сваіх поглядах на гэтае пытанне. Так, апытанні аўтарытэтнай сацыялагічнай службы Ipsos, праведзеныя сярод 20 тысяч жыхароў трох дзясяткаў краін, паказалі, што іспанцы лічаць, быццам старасць надыходзіць у 74 гады, французы — што ў 69, у ЗША, Канадзе, Швецыі называюць узростам старасці 66 гадоў, у Расіі — 61 год, а ў Саудаўскай Аравіі і зусім 55 гадоў. А па даных СААЗ, чалавек лічыцца пажылым у 60–74 гады, старым — у 75–89 гадоў, доўгажыхаром — у 90 гадоў і старэйшы.

* * *

А цяпер пра тое, чаму ўзрост — не абавязкова падстава для песімізму. Таму, што ёсць рэчы, на якія мы можам уплываць.

Калі ў нас ёсць яшчэ планы на жыццё, калі мы паставілі перад сабой нейкую мэту, якой хочам дасягнуць, то нам не будзе часу перажываць пра хуткаплыннасць жыцця.

Менавіта таму на Захадзе зараз так распаўсюджана сярод пажылых валанцёрства, і апошнім часам гэты рух патроху прыходзіць і да нас.

У ЗША, напрыклад, ужо шмат гадоў існуе такая ініцыятыва: пажылыя людзі дапамагаюць настаўнікам школ. Проста дапамагаюць бясплатна, як сацыяльныя работнікі, як выхавальнікі. І медыкі, якія назіралі за гэтымі пажылымі на працягу некалькіх гадоў, кантралюючы іх рост, вагу, узровень халестэрыну, ціск і многія іншыя параметры, высветлілі, што яны ў цэлым сябе лепш адчуваюць, чым тыя, хто гэтым не займаецца. Гэта сур'ёзныя навуковыя даныя і добры рэцэпт, як зрабіць сваё жыццё асэнсаваным і больш шчаслівым.

А калі прыслухацца да пісьменнікаў і паэтаў, то іх меркаванні таксама практычна нічым не адрозніваюцца ад навукоўцаў. Так, 82-гадовая брытанская пісьменніца Пенелопа Лайвлі ў інтэрв'ю сказала, што гарантыяй шчаслівага старэння з'яўляецца пазіцыя «ўважлівага вандроўніка ў часе». Гэта значыць — калі вы захаваеце цікавасць да жыцця, то старасць не стане для вас нейкім «бляклым месцам».

І, па вялікім рахунку, думаецца, на гэтым жыццёвым этапе ўжо няма нічога, што з'яўляецца «абавязковым», і ў гэтым таксама ёсць сваё харство. Таму лепш не слухаць нічыіх парад і адкінуць усе абагульненні. І, прыняўшы свой узрост, пачаць весці той спосаб жыцця, які здаецца найбольш прыдатным менавіта вам. Гэта і будзе паспяховая старасць, нават калі камусьці яе вобраз можа і не спадабацца. Але што вам з гэтага? Проста важдацца з унукамі і градкамі, калі гэта напаўняе вас радасцю, — таксама выдатна, нават калі вам усяго толькі 50.

Святлана БУСЬКО.

Крымінал, здарэнні

ЛІПАВЫ БРОКЕР ВЫМАНІЎ АМАЛЬ 50 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

Па дапамогу ў міліцыю Кастрычніцкага РАУС Гродна звярнулася жыхарка, якая пазбавілася амаль 127 тысяч рублёў. Менавіта столькі ў яе выманіў брокер адной з анлайн-платформаў біржавых таргоў. Падрабязнасці прыводзіць МУС.

Гісторыя пачалася два месяцы таму: аб'яву пра дзяржаўную праграму па павышэнні дабрабыту беларусаў жанчына ўбачыла ў «Інстаграме». Пакінула заяўку, зарэгістравалася, перавяла 100 долараў першапачатковага капіталу і... ужо праз некалькі хвілін ёй патэлефанавала брокер «Аляксандра».

У далейшым кожную раніцу дзяўчына паведамляла наваспечанаму трэйдару аб паспяховых здзелках, прасіла папаўняць рахунак. Усе налічэнні адбіваліся на балансе, што спачатку і сыграла на руку аферыстам — жанчына пераводзіла ім розныя сумы.

Калі грошы скончыліся, яна па парадзе брокера брала крэдыты ў банку, абрасла даўгамі. Аднак абнавіць рахунак не атрымалася — прадстаўнікі платформы на любых падставах угаворвалі яе не сыходзіць з біржы. «Аляксандра» нават прасіла яе прадаць кватэру. У выніку кампанія паставіла ўльтыматум: унесці чарговы плацеж, або рахунак будзе ануляваны. Пасля гэтага жанчына напісала заяву ў міліцыю.

Следчыя распачалі крымінальную справу за махлярства ў асабліва буйным памеры.

У Галоўным упраўленні крымінальнага вышуку МУС расказалі, што падобныя лжэброкеры карыстаюцца даверам наіўных інвестараў і іх жаданнем хутка разбагацець. З пачатку года ў міліцыю паступіла каля 20 заяў пра падобныя махінацыі. Ва ўсіх выпадках інвестары заставаліся ні з чым.

Каб не стаць ахвярай махляроў, неабходна сабраць максімум інфармацыі аб дзейнасці брокера. Калі кампанія працуе даўно, звестак пра яе павінна быць шмат. Іх адсутнасць — падстава для трывогі.

У выпадку ўзнікнення складанасцяў з вывадам сродкаў, іх блакіравання магчымасці ўплываць на кампаніі, зарэгістраваныя за межамі Беларусі, нават калі яны сапраўды існуюць, вельмі абмежаваныя. Стаць удзельнікам глабальнага фінансавага рынку можа кожны беларус. Брокерскія паслугі на тэрыторыі краіны афіцыйна аказваюць юрыдычныя асобы, унесеныя ў рэестр форэкс-кампаній Нацыянальнага банка.

АЛАБАІ ЗАГРЫЗЛІ КАРЛІКАВАГА ПУДЗЕЛЯ

Здарэнне адбылося ў пасёлку Паўднёвы ў Гродне, паведамляе УУС аблвыканкама.

У 26-гадовага мясцовага жыхара на тэрыторыі прыватнага дома пражываюць два сабакі пароды алабай. З часам буйныя гадаванцы прарабілі дзірку ў плоце і ўжо не раз ўцякалі. Каля сямі раніцы яны такім чынам зноў апынуліся на вуліцы.

Бескантрольная прагулка скончылася сумна. Бегаючы па Паўднёвым, алабаі сустрэлі карлікавага пудзеля. Гэты гадаванец жыў у доме, але выбягаў на двор і часам на вуліцу. Буйныя сабакі смяротна яго пакусалі. У гэты час дадому вяртаўся ўладальнік пудзеля. Падышоўшы да яго, гаспадар убачыў, што той не падае прыкмет жыцця.

Уладальнік алабаяў не адмаўляе, што яго гадаванцы могуць самі выбрацца на вуліцу і такое адбывалася раней. У дачыненні да мужчыны складзены адміністрацыйны пратакол за парушэнне правіл утрымання хатніх жывёл. Санкцыя артыкула прадугледжвае штраф да 810 рублёў або адміністрацыйны арышт.

РАСПАЧАЛОСЯ ПАЛЯВАННЕ НА КАЗУЛЮ

З 15 мая можна здабываць дарослых самцоў казулі, а таксама селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту.

Паляваць можна на працягу сутак індывідуальнымі спосабамі — ружэйным з засады і з падыходу. Дазволена выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй кулі звыш 1500 джоўлей, гладкаствольную паляўнічую зброю з патронамі з куляй або карцеччу, паляўнічыя лукі і арбалеты.

Прымяненне на паляванні паляўнічых нажоў, асвятляльных прыбораў, аптычных, каліматарных і іншых прыцэлаў і прыцэльных прыстасаванняў для зброі, бінокляў, прыбораў і прыцэлаў начнога бачання, сігнальных сродкаў, у тым ліку сігнальнай зброі, сродкаў камунікацыі і сувязі, акладных сцяжкоў, падсадных жывёл, чучалаў, профіляў, вабікаў, прынад і іншых сродкаў прынаджвання паляўнічых жывёл дазваляецца без абмежаванняў, акрамя выпадкаў, прапісаных у Правілах вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Слоўніца

УНІЗ ПА РАЦЭ

Куды ганялі плыты нашы продкі?

З XVI да XIX стагоддзя па паўнаводных рэках Беларусі выпраўляліся караваны з плытоў. Наш лес быў запатрабаваны ў Еўропе. Гандлярам даводзілася прытрымлівацца даволі жорсткіх стандартаў. Напрыклад, брусы англійскія ці галандскія мусілі быць пэўнай даўжыні і дыяметра. Нізкагатунковы тавар маглі альбо наогул не прыняць ці даць за яго малыя грошы. Гандаль лесам (сплаўлялі бярвёны, брусы, спецыяльна падагнаную клёпку) быў наладжаны на высокім узроўні. Сплаўлялася вельмі вялікая колькасць матэрыялаў. Напрыклад, англічане так добра пагаспадарылі на Прыпяці, што засталася назва дубовага бруса, а некаторых беларускіх дуброў не стала.

Адзін з аўтараў-укладальнікаў кнігі «Плытніцтва: тэматычны слоўнік» і навуковы рэдактар працы, загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Вераніка КУРЦОВА.

Расшыфруем верш класіка?

Натуральна, прафесія плытагона была добра знаёма беларусам. Перагонка плыта па Нёмане магла займаць ад чатырох да дзевяці тыдняў. Заробак быў у 35 рублёў. Калі ўлічыць тагачасныя цэны, дык на зарплату плытагона можна было купіць каля 100 кілаграмаў ялавічыны. Здаецца, нямала, але за страчаныя ў дарозе бярвенні можна было пазбавіцца гэтага прыбытку. На такія экстрэмальныя заробкі людзей падбіваў голад і галеча — усё ж хлеб гэты быў надта цяжкі. Лес сплаўлялі ранняй вясной, цэлымі днямі плытнікі знаходзіліся на адкрытым паветры. Мерзлі, моклі пад дажджамі, саслізгвалі з бярвенняў у ледзяную ваду. Многія з іх атрымлівалі хваробы, у тым ліку такія, ад якіх пасля маглі пакутаваць доўгія гады. Да таго ж справа гэта была небяспечная. Даводзілася праходзіць крутыя павароты, парогі, камяні, што выступалі з вады. Такі занятак патрабаваў досведу, спрыту, кемлівасці, вытрымкі, мужнасці. Ці не адлюстраванне гэта найлепшых якасцяў характару беларусаў? Усё, што звязана з плытніцтвам, стала нашым агульнакультурным набыткам. Не меншую каштоўнасць уяўляе сабой лексіка, якая адлюстравала гэты вельмі цяжкі занятак.

Прачытайце верш «Плытнікі» Якуба Коласа, дзе ён апісаў занятак, якім займаліся блізкія яму людзі. Сёння многія са слоў, якія выкарыстаў класік, нам здаюцца незразумелымі, але гэта лёгка выправіць. Дастаткова звярнуцца да тэматычнага слоўніка «Плытніцтва», які пабачыў свет дзякуючы намаганням супрацоўнікаў аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі. Гэта першы і адзіны ў нацыянальнай мовазнаўчай навуцы слоўнік, дзе сістэматызаваны лексічныя матэрыялы, прысвечаныя адыходнаму неземляробчаму промыслу беларусаў.

Гартоль, саха, арала...

Вучоныя Інстытута мовазнаўства вельмі многа робяць для захавання не толькі мовы, але і інфармацыі пра жыццё, заняткі, назіранні нашых продкаў. Так, з папярэдніх тэматычных слоўнікаў мы можам даведацца пра сельскую гаспадарку, жывёльны і раслінны свет. Але адна справа — збіраць словы, звязаныя з традыцыйным побытам і рэаліямі, што існуюць у наш час, і зусім іншая — інфармацыю аб промысле, які ўжо знік, — з развіццём чыгункі ў XIX стагоддзі плытніцтва перастала быць запатрабаваным, хоць плыты яшчэ працягвалі ганяць ажно да сярэдзіны мінулага стагоддзя.

«Слоўная спадчына — унікальная, спецыфічная. Не паспелі сёння знайсці чалавека, які растлумачыць паняцце, заўтра можа быць позна — страціцца слова, а з ім і культурны феномен, які гэта слова прэзентавала. І гэта страта будзе незваротнай, — заўважыла рэцэнзент выдання, **доктар філалагічных навук, прафесар Ірына ГАПОНЕНКА.** — Такую спадчыну трэба збіраць і абараняць менавіта цяпер. Праца, якую праводзіць Інстытут мовазнаўства па зборы, упарадкаванні, сістэматызацыі матэрыялу, можа лічыцца найактуальнейшай, а вынікі яе — адным з найважнейшых дасягненняў айчыннай і ўвогуле славянскай лінгвістыкі. Многія лексемы, якія ўвайшлі ў зборнік «Плытніцтва», упершыню ўведзены ў навуковы зварот, іх можна прыраўноўваць да лінгвістычных адкрыццяў».

У слоўнік уключаны лексічныя матэрыялы, якія збіраліся з тэрыторыі басейнаў асноўных буйных рэк Беларусі. І нашу краіну раней можна было нават называць плытніцкай дзяржавай: настолькі быў распаўсюджаны гэты занятак.

У асноўным моўныя адзінкі, звязаныя з плытніцтвам, занатоўваліся падчас абследавання населеных пунктаў пры рабоце над такімі буйнымі выданнямі, як «Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча», «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак», «Агульнаславянскі лексічны атлас». Гэта экспедыцыі 60—70-х і сярэдзіны 80-х гадоў XX стагоддзя.

Уражвае ахоп крыніц, якія вывучаліся пры падрыхтоўцы выдання: ад геаграфіі і статыстыкі XIX стагоддзя, архіўных звестак, матэрыялаў, сабраных дыялектолагамі і этнографамі, да сучасных палявых збораў. Нават цяжка ўявіць, колькі намаганняў прыйшлося прыкласці невялікаму аўтарскаму калектыву, каб упарадкаваць сабраны матэрыял і даць дэфініцыю кожнаму слову. Ну як вызначыць, для чаго выкарыстоўвалі арала, гартоль, саху, барбару? Чым адрозніваецца шархавіна, рамжына, паклеса ад жорасці? Дзе вязалі плыт гужбой, гальвай, клібай, шварай, шырхоўкай і іншай прывяззю? Дзе плылі ганкі, глейні, лавы, грабёнкі, пасы, таркі?

Новае выданне «Плытніцтва» паказвае адметны пласт беларускай вытворчай культуры. З кнігі можна даведацца, як называліся плыты, іх звёны і іншыя часткі, прыстасаванні і сродкі для звязвання бярвёнаў у плыт і цэлыя караваны (яны маглі быць з дзясяткаў звёнаў). Пры дапамозе якіх прылад кіравалі, тармазілі, адпіхваліся, прычальвалі. Як звалі работнікаў, што ганялі плыты, якія былі абавязкі ў галаўніка, штырніка, тарнавога, задніка, корніка, цальніка, дубовіка, шульмана, маладца.

Выданні Інстытута мовазнаўства.



Плыты маглі быць з некалькіх звёнаў.

Дзе плытагоны маглі схавацца ў непагадзь, якія назвы давалі небяспечным месцам на рацэ. Вы пабываеце і на румах — месцах, куды звозіўся нарыхтаваны лес і атрымаеце ўяўленне, якія былі віды сплаўнога матэрыялу.

Слоўнік падкажа, з якіх моў прыйшлі запазычанні, звязаныя з гандлем лесам. Дарэчы, такія моўныя кантакты таксама сведчаць пра багатыя эканамічныя адносіны з Захадам.

Выданне заслугоўвае ўвагі розных спецыялістаў: не толькі лінгвістаў, але і этнографаў, гісторыкаў, людзей, якія займаюцца эканомікай.

Ініцыятыва

КАБ ЛЮБІЦЬ БЕЛАРУСЬ НАШУ МІЛУЮ...

...трэба больш па ёй падарожнічаць, збіраць інфармацыю і дзяліцца ёй з іншымі. Дзякуючы разнастайным праектам — а гэта могуць быць фотаальбомы, інтэрактыўныя экскурсіі, інтэрнэт-рэсурсы, майстар-класы па рамёствах і народнай кухні і нават настольныя гульні — можна знаёміцца з беларускай гісторыяй і культурай, адкрываць новыя факты, намячаць маршруты для падарожжаў.

Пра каларыт, самабытнасць і прыгажосць Беларусі будзе апавядаць інтэрактыўная карта Беларусі, на стварэнне якой цяпер усім светам збіраюцца грошы на краўдфандынгавай пляцоўцы Ulej. Новы кішэнны гід будзе вельмі зручны для падарожнікаў — трэба толькі абраць найбольш цікавы для сябе напрамак. Іх тут прапануецца 32, прычым усе яны шчыльна звязаныя паміж сабой і ствараюць поўную карціну Беларусі. Гастратуры, аздараўленне, гістарычныя славутасці, знаёмства з флорай і фаўнай — гэта толькі асобныя тэмы-падказкі для падарожжаў. Аўтары праекта нават сабралі ў жыхароў розных куткоў Беларусі інфармацыю пра месцы, дзе тыя любяць бавіць час, і таксама дадалі гэта ў інтэрактыўную карту. Куды схадзіць увечары, дзе смачнейшыя стравы, якія паркі адпачынку варта наведаць, дзе можна скакаць з парашутам — усё гэта вы знойдзеце тут. Інтэрактыўная карта-даведнік спачатку будзе стварацца на беларускай, рускай і англійскай мовах, пасля плануюцца пераклады на мовы краін-суседак. Мэта праекта — паказаць Беларусь як цікавы турыстычны напрамак для айчынных падарожнікаў і замежных гасцей.

На працягу трох гадоў Раман Клеўжыц вандруе па Беларусі і замалёўвае ў скрэтчбуках помнікі архітэктуры і прыроды (дубы-волаты, каменныя крыжы, валуны). У выніку ў яго сабралася столькі матэрыялаў, што сваім захапленнем ён вырашыў падзяліцца з іншымі, — стварае дызайнерскія карты, дзе падрабязна прамаляваны ўсе раёны Беларусі, паштоўкі і стыкерпакі з матэрыяламі, сабранымі падчас вандровак.

Тысячы кіламетраў на цягніках, аўтобусах, веласіпедзе і пешшу пераадолеў яшчэ адзін вандроўнік, улюбёны ў Беларусь, — Дзяніс Блішч. Ён абследаваў больш за сотню раённых цэнтраў, назіраў за жыццём у глыбінцы, фіксаваў

на фотакамеру побыт жыхароў, іх звычаі, спробы змяніць прастору вакол сябе.

У выніку нарадзілася ідэя новага праекта — аўтарскай энцыклапедыі пра найбольш значныя населеныя пункты краіны glubinka.by. У планах — сфатаграфаваць 1300 населеных пунктаў! Місія праекта — «пасеяць» інфармацыю аб краіне і яе жыхарах, захаваць для наступных пакаленняў кавалачкі сучаснай гісторыі гарадоў і вёсак.

Усе ахвотныя могуць узяць удзел у міжнародным фотаспаборніцтве «Вікі любіць Зямлю — 2020» у Беларусі. Фатаграфіі з прыродных ахоўных тэрыторый, нацыянальных паркаў, запаведнікаў і маляўнічых краявідаў можна на працягу чэрвеня загружаць у «Вікісховішча». Гэтыя работы спатрэбяцца для таго, каб праілюстраваць артыкулы ў вольнай энцыклапедыі «Вікіпедыя». Адначасова ў чэрвені ладзіцца і спаборніцтва па стварэнні публікацый пра помнікі прыроды Беларусі.

Матэрыялы падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Жывая гісторыя

ПАД НЯСВІЖАМ ЗНОЙДЗЕНЫ КАМЕНЬ АДАМА МІЦКЕВІЧА?

«Ewa raj utracila...» — так пачынаецца надпіс на валуне, які знайшоў у вёсцы Студзёнкі непадалёк ад Нясвіжа мясцовы краязнавец Аляксандр Абрамовіч. Знаходку можна лічыць без перабольшання ўнікальнай, бо камень гэты — рэчыўнае пацвярджэнне, што ў Студзёнках бываў Адам Міцкевіч, які і пакінуў памятны надпіс у «гасцявой кнізе» тагачаснай гаспадыні вясковай сядзібы, а мясцовыя краявіды згадаў у паэме «Пан Тадэвуш».



Звесткі пра камень, гаворыць краязнавец, ёсць у гістарычных мемуарах — прынамсі ва ўспамінах ксяндза Ежы Каліноўскага, зводнага брата пахаванага ў Студзёнках Віктара Каліноўскага, які, у сваю чаргу, быў сваяком знакамітага правадыра паўстання 1863 года Кастуся Каліноўскага. «Я пра камень даведаўся зусім нядаўна, шукаючы помнікі з былых панскіх могілак, што былі знесеныя ў 50–60-я гады мінулага стагоддзя. Мне даслала спасылку на гэты дакумент сяброўка па «Фэйсбуку» Юліта Нэйман — вялікі адмыслоўца па генеалогіі, хоць, зразумела, на аматарскім узроўні, бо сама яна былы медык», — расказаў «Звяздзе» спадар Аляксандр Абрамовіч.

Наогул, Студзёнкі — вёска хоць і невялікая, але з багатай гісторыяй, у якой хапае гучных імёнаў. Сярод іх і Радзівілы, якім шмат гадоў належала вёска, і згаданыя ўжо Каліноўскія, якія былі арандатарамі вясковага маёнтка, генерал Ян Развадоўскі — другі муж Кацярыны Мараўскай, сястры знакамітага Караля Станіслава Радзівіла па мянушцы Пане Каханку (а ўнук гэтага Яна, таксама Ян Развадоўскі, лічыцца заснавальнікам Баранавіч). Што да панскага маёнтка, то, паводле ўспамінаў сучаснікаў, гэта быў аднапавярховы дом, утульны і прыгожа аздоблены, з хатняй капліцай і трыма гасцёўнямі. Дом стаяў у вялікім прыгожым парку, дзе меліся таксама дзве сажалкі, злучаныя паміж сабой рэчкай, і так прыгожа ўсё гэта выглядала разам, што Адам Міцкевіч, які наведаў Студзёнкі, назваў іх малым зямным раем і так напісаў у альбоме гаспадыні маёнтка: «Ева рай страціла, Ты ж яго, пані, стварыла». На памяць аб візіце паэта, кажуць, тыя словы і выбіў на камені мясцовы разьбяр.

...Памятны камень быў знойдзены амаль што выпадкова — у сцяне адчыненага склепа непадалёк ад былых панскіх могілак. Памер бачнай яго часткі 85х64 сантыметры. «Выглядае на тое, што напісана почыркам Міцкевіча, — гаворыць краязнавец, — дакладна бачна «Ewa raj utracila Tys go wskrzesila», і «Mickiewicz». Каб расчытаць астатняе, трэба звяртацца да спецыялістаў».

«Звязда» звярнулася з просьбай дапамагчы ў расшыфроўцы да супрацоўнікаў дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку, якія маюць узоры почырку паэта. Аб выніках работы спецыялістаў і тым, які працяг атрымае гэта гісторыя, мы абавязкова раскажам пазней.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота з «Фэйсбука» Аляксандра АБРАМОВІЧА.

На аддаленцы

ДАСТУПНЫЯ СТАРАДРУКІ

Больш за дзве з паловай тысячы рэдкіх дакументаў і старадрукаў, якія захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, сталі даступныя чытачам анлайн. Сярод іх выданні Францыска Скарыны, Лаўрэнція Зізанія, Сімяона Полацкага, Пятра Мсціслаўца. Карыстальнікі могуць прагледзець выданні XVI—XVII стагоддзяў, што выходзілі ў Вільні, Гродне, Кіеве, Супраслі. Зроблены лічбавыя копіі ўнікальных кніг беларускіх аўтараў: Максіма Гарэцкага, Алаізы Пашкевіч, Якуба Коласа, Янкі Купалы, якія былі надрукаваныя ў пачатку мінулага стагоддзя, а зборнік паэзіі «Вянок» мае дароўны надпіс, зроблены самім аўтарам — Максімам Багдановічам.

Таксама супрацоўнікі бібліятэкі звяртаюць увагу на тое, што ў анлайн-рэжыме можна пазнаёміцца са зводным электронным інфармацыйным рэсурсам «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі». Дзякуючы яму можна даведацца, якія дакументы ствараліся на нашай зямлі ў розныя часы. У бібліятэцы вядзецца работа дзеля таго, каб звесткі пра гэтыя крыніцы інфармацыі сабраць і зрабіць даступнымі для ўсіх зацікаўленых.

Пласты гісторыі

ПАМЯЦЬ АД ПРОДКАЎ ДА НАШЫХ ДЗЁН

Другую чаргу археалагічнага музея пад адкрытым небам у Белавежскай пушчы плануюць адкрыць сёлета. Аб гэтым паведаміў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вадзім ЛАКІЗА:**

— Жыхары нашай краіны, замежныя госці, калі ў іх будзе магчымасць прыехаць, змогуць азнаёміцца з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі позняга жалезнага веку. Археалагічны музей на тэрыторыі Белавежскай пушчы — першы комплекс такога тыпу ў Беларусі. Летась была адкрыта яго першая чарга. Падобныя помнікі археалогіі дапамагаюць выхоўваць гістарычную памяць і патрыятызм, яны заўсёды цікавыя турыстам. Па археалагічных дадзеных было адноўлена ўмацаванае гарадзішча позняга бронзавага — ранняга жалезнага вякоў, якое адносіцца да VIII стагоддзя да нашай эры — V стагоддзя нашай эры. У перспектыве такі турыстычны аб'ект будзе ўключаць сем музейных комплексаў, якія будуць адлюстроўваць асаблівасці развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры заходніх рэгіёнаў Беларусі розных гістарычных перыядаў ад каменнага веку да Сярэднявечча.

Сёлета былі праведзены археалагічныя даследаванні і добраўпарадкаванне мясцовасці ў Бялынічах, дзе ў верасні пройдзе Дзень беларускай пісьменнасці. Шмат археалагічных работ вядзецца ў Полацку — прыярытэтным напрамкам з'яўляецца забеспячэнне патрэбных археалагічных даследаванняў Полацкага замчышча. Важны кірунак работы — падрыхтоўка праектаў аховы помнікаў археалогіі, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны. На сёння такіх помнікаў звыш дзвюх тысяч. Да таго ж, вядзецца рэестр тых культурных каштоўнасцяў, якія не ўвайшлі ў вышэйназваны спіс. Зараз ён налічвае больш за пяць тысяч аб'ектаў. Многія з іх патрабуюць актуалізацыі, бо яны былі знойдзены ў 50-я-70-я гады, калі не было дакладных карт, былі іншыя раёны.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Пантэон Айчыны

Валенцій Ваньковіч (1800—1842)

Валенцій Ваньковіч належаў да плеяды мастакоў, якія лічылі творчасць духоўнай місіяй па ўдасканаленні чалавека, узвышэнні яго душы. Таму чалавек і стаў галоўным героем яго твораў.

Здольнасці да выяўленчага мастацтва Валенцій праявіў ужо ў дзяцінстве, маляваў усё, што бачыў. Бацька, старшыня Мінскага галоўнага суда Мельхіёр Ваньковіч, аддаў 12-гадовага сына на вучобу ў Полацкую езуіцкую акадэмію на факультэт вольных навук і старажытных і сучасных моў. Але душа хлопчыка цягнулася да жывапісу. Уражаны карцінамі з багатай акадэмічнай галерэі, ён цвёрда вырашыў стаць мастаком і стварыць такое ж харство.

У акадэміі хлопец навучыўся выдатна маляваць, чым уразіў выкладчыкаў жывапісу Віленскага ўніверсітэта — такіх мэтраў, як Ян Рустэм і Ян Дамель. Яшчэ больш былі ўражаныя студэнты, якім не верылася, што 16-гадовы юнак з правінцыі можа рабіць гэта так «добра і правільна». А вучыліся разам з Ваньковічам тыя, чые імёны пасля ўвойдуць у гісторыю беларускага мастацтва, — Міхаіл Кулеша, Вінцэнт Смакоўскі, Канут Русецкі ды іншыя.

Прызнанне Ваньковіча як мастака прыйшло пасля карціны «Філактэт на востраве Лемнас» — ён атрымаў першую прэмію за найлепшую кампазіцыю. Валенцій пачынае паказваць свае работы на выстаўках, напрыклад, у 1820 годзе на выстаўцы ў Віленскім універсітэце экспанаваліся карціны алеем «Стары», «Пеўчыя», «Аўтапартрэт».

У віленскі перыяд раскрыўся талент Ваньковіча-партрэтыста. Ён піша эцюдныя партрэты сваіх сяброў: Адама Міцкевіча, Францішка Малеўскага, Юліяна Корсака, Эдварда Ромера, Аляксандра Адынца, якія пасля прыняцуць славу і сваёй альма-матар, і Беларусі. У гэтых партрэтах ужо праявіўся творчы стыль Ваньковіча: мастак старанна прапрацоўваў твар, імкнуўся паказаць своеасаблівасць чалавека, раскрыць яго ўнутраны свет, адлюстраваць індывідуальнасць рыс характара і настрой.

Мастацкую адукацыю Ваньковіч працягваў атрымліваць у Імператарскай акадэміі мастацтваў, куды яго ў 1824 годзе прынялі па хадайніцтве Савета Віленскага ўніверсітэта, пры гэтым Валенція адразу залічылі на старшы курс натурнага класа. Поспехі яго ў навучанні былі адзначаны спачатку сярэбраным медалём, а пасля і залатым. Прафесары-настаўнікі здзіўляліся ўменню Ваньковіча спалучаць святло і цені, дакладна перадаваць натуру. Маляваў ён хутка і лёгка — дыпломную работу Ваньковіч напісаў за тры месяцы. Такое ўражанне, што ён спяшаўся жыць, нібыта прадчуваў свой нядоўгі век, і хацеў выйграць час, каб зрабіць як мага больш.

На жаль, творчая спадчына мастака раскідана па свеце і дагэтуль лёс многіх яго карцін не вядомы. Вось і дыпломная рэч «Подзвіг маладога кіяўляніна пры аблозе Кіева» (паводле гістарычнай легенды з «Аповесці мінулых гадоў»), узнагароджаная залатым медалём, невядома дзе падзелася. Пасля сканчэння акадэміі Ваньковіч застаўся ў Пецярбургу, каб удасканальваць сваё майстэрства. Ён пазнаёміўся з шэдэўрамі еўрапейскіх і рускіх мастакоў. Падобныя знаёмствы альбо нараджаюць пачуццё сваёй нікчэмнасці, альбо, наадварот, натхняюць на творчасць. Беларускі жывапісец хацеў дасягнуць дасканаласці і вытанчанасці, але не жадаў быць пераймальнікам, таму вырашыў прытрымлівацца «крыху іншага метаду малявання». Майстэрню Ваньковіча часта наведвалі сябры і знаёмыя, каб паглядзець яго работы, бо ён праславіўся як адзін з найлепшых у Пецярбургу партрэтыстаў. Шэдэўрам стаў славуты партрэт «Адам Міцкевіч на скале Аю-Даг», напісаны ў 1827—1828 гадах. Паэт паказаны тут як мяцежны адзінокі чалавек і натхнёны творца. Ваньковіч напісаў таксама партрэты паэтаў Аляксандра Пушкіна і Васіля Жукоўскага, але лёс гэтых карцін невядомы. Героямі твораў Ваньковіча былі пераважна творчыя асобы, бо і сам ён любіў паэзію і музыку, меў тонкую і чуллівую душу.

У сярэдзіне 1829 года мастак вярнуўся на радзіму і пасяліўся ў маёнтку Сляпянка каля Мінска. Тут ён піша партрэты членаў сям'і Ваньковічаў, іх родных і сваякоў. Вяршыняй гэтага перыяду можна прызнаць напісаны ў 1834 годзе «Партрэт жонкі з дзецьмі», у якім відавочны ўплыў матываў Рафаэля. Пад уплывам містыка Таваньскага Ваньковіч звярнуўся да рэлігійных сюжэтаў. Ён быў перакананы, што вера павінна грунтавацца на добрых учынках, а таму шчодрай рукой раздаваў свае карціны, нават узнагароды, пераважную частку сваіх сродкаў ахвяраваў беднякам. А сваё мастацтва прысвяціў Богу. «Мадонна», напісаная ім з сялянскай дзяўчыны, цяпер знаходзіцца ў Луўры. Абраз святога Казіміра Ваньковіч падарыў Фарнаму касцёлу ў Гродне.

Паступова пагаршалася здароўе мастака, і ён вырашыў вырвацца з ціхай плыні сямейнага жыцця, каб паспець зрабіць яшчэ нешта важнае. Летам 1839 года, склаўшы завяшчанне, Ваньковіч пакідае Сляпянку і едзе ў Еўропу. У Дрэздэнскай галерэі ён капіруе палотны любімых Рафаэля, Мікеланджэла, Тынтарэта, Тыцыяна. Мастак не лячыўся, а працаваў — хацеў паспець стварыць тое, чаго не зрабіў. У Парыжы ён напісаў некалькі палоцен, прысвечаных Напалеону, шэраг рэлігійных твораў, а апошнюю работу «Маці Божая Вастрабрамская» перадаў у парыжскі касцёл Сен Севярын.

Вітаўт ЧАРОПКА.

ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова»

Лот	Наименование	Местонахождение	Начальная цена, бел. руб. с НДС	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Объект недвижимости – капитальное строение с инв. № 630/С-62355, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад нефтепродуктов. (со составными частями и принадлежностями) полный перечень смотрите на сайте https://orgtorg.by	Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ул. Заводская, 1	127 464,00	12 746,40	6373,20
2	Машина разрывная МР-500 (20-500) кН	Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, 1, вблизи п. Чисть	7 920,00	792,00	396,00

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые торги.

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 623886007601000532, площадь – 0,2623 га, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания склада нефтепродуктов

В отношении Лота № 2 имеется обременение: договор аренды

Условия

В случае признания аукциона несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе, участник может приобрести Предмет (Предметы) торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Предмет (Предметы) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Предмета (Предметов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Предмета (Предметов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Начало приема заявлений в 10.00 19.05.2020 г. Окончание приема заявлений в 16.00 19.06.2020 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Аукцион по лотам состоится 22.06.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by.

До подачи заявления необходимо внести задаток на р/**с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.

Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (Лот №__), проводимом __.__.2020 г.». **Срок внесения задатка: с 10.00 19.05.2020 г. по 16.00 19.06.2020 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами аукциона. Контактное лицо для осмотра Предметов: 8 029 303 18 05 (Новоселов Дмитрий Викторович).

По вопросам наличия обременений на вышеуказанные лоты обращаться по телефону 8 (029) 171 09 46 (Кибзюк Дмитрий Николаевич).

Дополнительная информация по предмету торгов по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Государственная регистрация договора купли-продажи объектов недвижимости, предприятия как имущественного комплекса и объектов недвижимости, входящих в его состав, осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

Организатор аукциона	ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121, тел. 8 (029) 305 86 50, e-mail: info.torgi@orgtorg.by, сайт https://orgtorg.by
Продавец	ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» в лице антикризисного управляющего ООО «Партнер-консультант» тел.: +375 (29) 698-51-76, +375 (29) 502-77-77, +375 (29) 392-89-06, +375 (17) 395-58-13

ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества коммунального производственного дочернего унитарного предприятия «МОЛОДЕЧНОСТРОЙМАТЕРИАЛЫ»

Лот	Наименование	Местонахождение	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона без НДС, бел. руб.
1	Лесопильный цех, инв. №630/С-46871, 647,0 кв. м Одноэтажный металлический деревообрабатывающий цех, инв. № 630/С-50950, 229,0 кв. м Одноэтажное сборно-щитовое здание слесарной мастерской, инв. № 630/С-50949 129,3 кв. м Навес, инв. № 630/С-79757, 13,0 кв. м Устройство для хранения опил. Нестанд. оборуд. (электро-тельфер) (инв. № 899)	Минская обл., г. Молодечно, ул. Сухая, 73	47532,00	4753,20	2376,60

В отношении вышеуказанного имущества проводятся пятые повторные торги (цена снижена на 40 %). **Окончание приема заявлений в 16.00 03.06.2020**

Публикации об аукционе ранее размещались в газете «Звязда» № 198 от 17.10.2019, № 233 (29100) от 07.12.2019, № 9 (29123) от 16.01.2020, № 36 (29150) от 22.02.2020, № 69 от 09.04.2020

